№ 9 (367) 5 сакавіка 2004 www.nn.by

# Наша Ніва

ПЕРШАЯ БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЭТА

Заснаваная ў 1906. Адноўленая ў 1991. Выходзіць у пятніцы

# Жанчыны выходзяць з-пад кантролю

**Хто можа стаць прэзыдэнткай Беларусі**

...параўнаў Ірыну Красоўскую з Карасон Акіна.

старонкі 8–9

**10 антыжанчынаў Беларусі**

Яны руйнуюць патрыярхальныя стэрэатыпы.

старонка 12

**Стагодзьдзе ў тварах**

Возьмем за А 1900 год.

старонка 13

**Дочкі мэгаполісу**

Даўно мінулі тыя часы, калі мамкі...

старонка 14




АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

## Тэсты і пратэсты

**Сыстэма ацэнкі ведаў на выхадзе са школы ўсё ж зьмяняецца. Старая сыстэма дае больш магчымасьцяў для карупцыі, але з кансэрватыўнай крытыкай новаўвядзеньняў выступіў Аляксандар Лукашэнка. Тым ня менш, пераход на тэсты адбудзецца.**

А.Лукашэнка на нарадзе зь міністрам адукацыі і рэктарам БДУ выказаў сумнеў у мэтазгоднасьці рэформы: «У мяне асабіста няма становучага меркаваньня, станоўчай ацэнкі самога тэставаньня. Мы адыходзім ад нашых традыцыяў гэтым самым. Экзамэн заўжды быў сьвятам. Гэта быў лад жыцьця школы. Самае галоўнае — мы ня бачым чалавека».

Ці азначае гэта, што цэнтралізаваныя тэсты і наагул рэформа школы, накіраваная на ўлучэньне яе ў агульнаэўрапейскую адукацыйную прастору, цяпер спыніцца?

Аднадушнага меркаваньня наконт гэтага няма, як не адназначна ставяцца спэцыялісты і да тэставаньня. Абавязковыя цэнтралізаваныя тэсты — сёлетняя навінка: раней іх можна было здаваць па жаданьні. Сёлета цэнтралізаваны тэст па мове (беларускай ці расейскай) стане абавязковым для здачы. Адзнакі, атрыманыя на тэстах, будуць выстаўляцца абітурыентам заміж іспытаў па адпаведных прадметах і залічвацца пры паступленьні ў ВНУ.

З аднаго боку, тэсты, як адзначае дацэнт БДУ Ўсевалад Рагойша, не заўсёды прыдатныя для ацэнкі вучня: «Тэставаньне само па сабе ня кепскае і ня добрае — гэта звычайны, нэўтральны пэдагагічны інструмэнт. Менавіта за сыстэму распрацаваных кантрольных тэстаў па беларускай літаратуры я атрымаў пэдагагічную катэгорыю. Але тэсты могуць быць розныя. З досьведу ведаю, што тыя тэсты, якія цяпер практыкуюцца на ўступных экзамэнах, накіраваныя на выяўленьне *найлепш падрыхтаваных*, а ня *здольных і таленавітых* абітурыентаў». Прарэктар БДУ па навучальнай працы Віктар Самахвал наагул адмаўляе карысьць тэстаў: «На 99% людзі ставяцца да гэтай сыстэмы адмоўна. Як можна прымаць абітурыента на спэцыяльнасьць «замежная мова» ці «журналістыка», калі ня бачыў яго?»

Зь іншага боку, тэсты даюць бесстароньнюю ацэнку: адказаў — атрымаў адзнаку толькі за веды, а не за адносіны з настаўнікамі ці знаёмства з выкладчыкам. Нават сёньняшнія тэсты, на думку У.Рагойшы, ужо далі плён: «За апошнія гады пасьпяховасьць сярод студэнтаў БДУ ўзрасла шматкроць, узровень эрудыцыі нашмат вышэйшы, як пяць гадоў таму. Чынавенскія інтарэсы таксама задаволеныя: статыстыка пасьпяховасьці добрая, сярэднія балы паказальныя. Але, з другога боку, праз цяперашнюю сыстэму тэставаньня сапраўды надзвычай цяжка прайсьці здольнаму вяскоўцу — у вёсцы няма бібліятэкі, а пару месяцаў на год даводзіцца замест школы хадзіць на бульбяныя ды буракавыя палеткі.

**Працяг на старонцы 2.**

**Тыдзень без чужога слова**

«Наша Ніва» — незалежная крыніца інфармацыі і грунтоўны аналітык беларускага і міжнароднага жыцьця. «Наша Ніва» — гэта 16 старонак без чужога слова штотыдзень. Дык падпісвайся!

Газэта была заснаваная ў 1906 годзе, адноўленая ў 1991 годзе. Пасьля аднаўленьня выходзіць ужо 13 гадоў.

Падпісны індэкс 63125. Падпіску прымаюць на любой пошце, а ў Менску — і на шапікі «Белсаюздруку» ды ў прыватным агенцтве «Эй Бі ПрэсСэрвіс». Цана на месяц — 2580 рублёў на поштах або 1800 рублёў на шапікі «Белсаюздруку». Адкрытая падпіска на другі квартал.

## ТЫДЗЕНЬ НАШАГА ЖЫЦЬЦЯ

Сацыяльная і палітычная эмансыпацыя беларусак адбылася ў савецкія часы. За апошнія ж 20 гадоў зьмяніліся перадусім сэксуальныя паводзіны жанчынаў. Напрыклад, другі пол выразьней усьвядоміў сваё права на асалоду. Адпаведна, усё больш жанчынаў успрымаюць сэкс не як сямейны абавязак, а як права. Праз гэта яны пачынаюць па-іншаму ставіцца да свайго цела, да спажываньня etc. Гэта мяняе жанчынаў, іхны стыль жыцьця, іх мастацтва. Шматлікіх мужчынаў такі працэс цьвеліць, некаторыя сацыёлягі трывожацца пра лёс сям'і і мацярынства. Жанчыны выходзяць з-пад кантролю: чаму, як, дакуль? Да гэтай тэмы зьвяртаецца «НН» перад 8 Сакавіка. **Старонкі 12—15**.

Тым ня менш, грамадзтва паранейшаму не гатовае прызнаць за жанчынамі права на палітычнае лідэрства, разважае Віталь Тарас на **старонцы 8**.

Чарговы газавы кантракт з «Транснафтай» сканчаецца ў той самы сьвяточны жаночы дзень. У сераду намесьнік старшыні «Газпраму» Аляксандар Разанаў падкрэсьліў, што галоўная ўмова расейскага боку — перадача ва ўласнасьць «Газпраму» 50% статутнага капіталу «Белтрансгазу». Валер Булгакаў грунтоўна аналізуе доўгатэрміновыя тэндэнцыі ў беларуска-расейскіх адносінах на **старонках 3—4**.

На наступным тыдні Нацыянальны аргкамітэт па сьвяткаваньні Дня Волі канчаткова вызначыць фармат урачыстасьцяў 25 Сакавіка. Сёлетняе сьвята законна можна ператвараць у Дзень «Народнай волі». Гэтак зьдзекуюцца з найбольшай дэмакратычнай газэты краіны! Абклалі бясконцымі судовымі справамі… Думаю, не адзін чалавек адмовіцца зараз купляць бялізну «Сэрж». Чытайце побач на **старонцы 2**.

І яшчэ раз нагадаю — вясна надышла.

**Андрэй Дынько**



АНАТОЛЬ КЛЯШЧУК

# Зьняважаны гонар

Сяргея Атрошчанкі

Суд Ленінскага раёну Менску задаволіў пазоў бізнэсоўца Сяргея Атрошчанкі да рэдакцыі газэты «Народная воля» і карэспандэнткі выданьня Марыны Коктыш. Газэце належыць выплаціць матэрыяльную кампэнсацыю спадару Атрошчанку 15 мільёнаў рублёў за абразу гонару, годнасьці й дзелавой рэпутацыі. Судзьдзя Вера Тупік сёньня пастанавіла, што надрукаваныя ў артыкуле «Якому бізнэсу ў Беларусі добра?» зьвесткі не адпавядаюць рэчаіснасьці. У тым артыкуле эканамісты й бізнэсоўцы камэнтавалі, не шкадуючы словаў, выказваньне С.Атрошчанкі, вытворцы бялізны «Сэрж», пра тое, што ў Беларусі «выдатныя ўмовы для бізнэсу».

Кіраўнік цэнтру абароны СМІ Беларускай асацыяцыі журналістаў, былы судзьдзя Канстытуцыйнага суду Міхаіл Пастухоў лічыць, што судзьдзя Вера Тупік прыняла палітычна матываванае рашэньне: «Выказваньні на старонках газэты мелі характар асабістага меркаваньня і ня тычыліся ўвогуле С.Атрошчанкі».

Ня першы раз С.Атрошчанка наступае на «Народную волю». Летась ён зарэгістраваў гандлёвую марку «Народная воля» і запатрабаваў ад пракуратуры Беларусі спыніць выхад газэты з такой назвай.

Галоўны рэдактар «Народнай волі» Іосіф Сярэдзіч зазначыў, што яму шкада судзьдзяў, якія пераўтварыліся ў інструмэнт прыдушэньня свабоды слова.

**Паводле радыё «Свабода»**

# Партыя №111

Аляксандар Лукашэнка выдаў дэкрэт №111 аб стварэньні ідэалягічнай вэртыкалі. Раней толькі асобныя палітолягі вялі гаворку аб прапрэзыдэнцкай партыі. Пасьля дэкрэту №111 патрэба ў будаўніцтве такой партыі адпала. Яе функцыі выканае ідэалягічная вэртыкаль.

Якая партыя мае такія рэсурсы: у малых раёнах — па тры вызваленыя работнікі, з насельніцтвам да 50 тысяч — па чатыры і г.д.? У краіне ў цэлым амаль тысяча вызваленых (за грошы выбаршчыкаў) байцоў за жыцьцёвыя інтарэсы ўлады!

Адпачывайце, «Пяцёрка+» і іншыя барацьбіты на выбарах у палату прадстаўнікоў. Дарэчы, менавіта выбары прымусілі ўлады выдаткаваць дадатковыя грошы на захаваньне свайго статус-кво. Бо скурай адчуваюць устойлівае пагаршэньне рэйтынгу. Дык трэба моцна трымаць уладу ў кіпцюрах, бо ўсякія дэмакраты «гатовы яе вырваць». А што барацьба будзе бяз правілаў, дык да гэтага зь дзяцінства рыхтаваліся. Вось яшчэ ўсіх бюджэтнікаў пасадзяць на кантракты, тады без усякіх праблем магчыма загнаць на датэрміновае галасаваньне 50% выбаршчыкаў і патрэбны вынік лёгка будзе намаляваны.

За ўсім гэтым і будзе віжаваць штатная квазіпартыя, «розум, гонар і сумленьне» сучаснай Беларусі. Беларусі, якая ўсё глыбей патанае ў таталітарным мінулым, што стала сёньняшнім днём працавітага народу. Як мінімум да 2006 году.

**Міхась Лагор, Гарадок**

**Польская фундацыя імя Рабэра Шумана і Беларускае Шуманаўскае таварыства (Польшча) запрашаюць на лекцыю Войцеха Барадзіча-Смаліньскага «Уводзіны ў сыстэму структурных фондаў Эўразьвязу. Выбраныя мадэлі падтрымкі мясцовага самакіраваньня». Лекцыя адбудзецца 6 сакавіка а 14-й у Беларускім ПЭН-Цэнтры (вул.Казлова, 7-101).**

# Тэсты і пратэсты

Працяг са старонкі 1.

Дый настаўнік на пэрыфэрыі заўсёды будзе менш прафэсійны. Дзяржава можа колькі хоча трымацца абавязковага разьмеркаваньня і будаваць дамы для «маладых спэцыялістаў», але факт застанецца фактам: добраму настаўніку, як і артысту або палітыку, патрэбная як мага большая і ўдзячная аўдыторыя, а таксама прафэсійныя кантакты — таму ўцёкі добрых пэдагогаў зь вёскі непазьбежныя. У гэтым сэнсе «пэрсанальны» іспыт і сапраўды лепшы за безаблічнае тэставаньне. Іншая рэч, калі ў тэсты па асобных прадметах паўключаць заданьні на творчасьць, нестандартнасьць рашэньня, псыхалягічную ды інтэлектуальную здатнасьць, што, зрэшты, і практыкуецца ў Эўропе. Але гэта ня зробіцца з наскоку і за адзін сэзон».

Экс-міністар адукацыі Пятро Брыгадзін, цяпер рэктар Інстытуту кіраваньня і сацыяльных тэхналёгіяў БДУ, лічыць, што сьпяшацца з увядзеньнем цэнтралізаваных тэстаў ня варта: «Тэсты — тэхналёгія, якая пасьпяхова выкарыстоўваецца ў бягучым кантролі ведаў і для выніковага кантролю. У многіх краінах сьвету ідзе экспэрымэнт па ўвядзеньні цэнтралізаванага тэставаньня, і некаторыя краіны нават цалкам перайшлі на яго. Але ж ня ўсе ставяцца да яе пазытыўна. Я размаўляў з рэктарамі маскоўскіх ВНУ — яны ставяць пад сумнеў гэтую сыстэму».

Уводзіць цэнтралізаваныя тэсты Беларусі ўсё ж давядзецца: гэтага вымагае Лісабонскае пагадненьне пра ўніфікацыю вышэйшай адукацыі ў Эўропе, ратыфікаванае Беларусяй. Іншая рэч, што шлях да гэтага будзе пакручасты: у сыстэме адукацыі маса савецкіх атавізмаў. Аднак, як кажа У.Рагойша, баяцца зьменаў ня варта: «Аб'ектыўна, дзеля дабра маладых людзей і будучыні навукі ды адукацыі ў цэлым (калі хто хоча — і дзеля справядлівасьці), варта было б перагледзець сыстэму тэставаньня дый сапраўды ўвесьці нейкія квоты для несталічных абітурыентаў. Баяцца няма чаго: пры сапраўды істотным павышэньні ўзроўню ўнівэрсытэцкай аўдыторыі і выразнай канкурэнцыі паміж студэнтамі, што мы сёньня назіраем, «лімітчык»-ніздара вельмі хутка выпадзе з плыні і балястам ня будзе».

**Аркадзь Шанскі**

ПАРАЎНАНЬНЕ

## Цана славацкага «Трансгазу»

Праз Славаччыну праходзяць магістральныя трубаправоды даўжынёй 2 тыс. км. Яны пампуюць тры чвэрці газу, які Расея пастаўляе ў Заходнюю Эўропу. Магістральныя трубаправоды «Белтрансгазу» ў тры разы даўжэйшыя (6 тыс. км). Славацкая «труба» надзвычай важная для «Газпрому». Аднак, нягледзячы на ціск Масквы, Брацiслава захавала кантрольны пакет акцый газатранспартнай кампаніі «СПП» за сабой.

Пакупнікамі 49% акцый славацкай кампаніі ў 2002 г. сталі нямецкі «Рургаз» і француcкі «Газ дэ Франс» у кансорцыюме з «Газпромам». За сваю долю яны заплацілі $2 млрд 765 млн.

## Кукабака асуджаны

Міхася Кукабаку зноў судзілі ў Маскве. 2 сакавіка суд Басманнага раёну сталіцы Расеі пакараў яго штрафам за ўдзел у мітынгу на Лубянскай плошчы з нагоды 60-х угодкаў дэпартацыі чачэнцаў. Кукабака быў самым вядомым беларускім дысыдэнтам у савецкія часы.

Мітынг 23 лютага быў несанкцыянаваны. Праз 25 хвілін пасьля пачатку яго разагнала міліцыя, 13 яго ўдзельнікаў былі затрыманыя. Кукабаку забралі з плякатам «Крэмль ня хоча спыніць вайну ў Чачэніі». Штраф складае 700 расейскіх рублёў (25 даляраў).

«Ня буду плаціць гэтага штрафу, — сказаў карэспандэнту «НН» былы палітвязень, які цяпер жыве ў Маскве. — Хай апісваюць маёмасьць, калі апэляцыя будзе адхіленая».

**Сяргей Ёрш**

## Туркмэнія кліча

Беларускія перакладчыкі «Рухнамы» Туркмэнбашы (Леанід Дранько-Майсюк, Анатоль Бутэвіч, Анатоль Кудравец) днямі вярнуліся з Туркмэністану. Прыватная паездка доўжылася тыдзень. Беларускіх гасьцей сустракалі з пашанай, вазілі з экскурсіямі, іх здымала туркмэнская тэлевізія. Вярнуліся беларускія літаратары пад вялікім уражаньнем ад таго, як Туркмэнбашы кіруе краінай. Адзін з удзельнікаў паездкі асабліва захапляўся тым, што за 10 гадоў у Туркмэністане ня скралі ніводнага аўтамабіля.

**Аркадзь Шанскі**

НАДВОР'Е

## Будзе шмат хлеба

**Колькасьць ападкаў у лютым перавысіла норму ў 1,5—3 разы. Асабліва шмат сьнегу нападала на поўначы. У Віцебску й Воршы сьнегавое покрыва складае 66—69 см — абсалютны рэкорд за ўвесь пэрыяд назіраньняў. Сьнежныя зімы вяртаюцца ў Беларусь. Нават дадатковую ночку высакоснага году зіма не прадрамала. З 29 лютага на 1 сакавіка ў Лідзе выпала 9 см сьнегу, у Менску — 7.**

# Расея мяняе беларускіх грамадзянаў на расейскіх агентаў

**Масква фактычна прызнала сваё дачыненьне да забойства ў Катары былога прэзыдэнта Чачэніі Зелімхана Яндарбіева. У гісторыю ўцягнутая і Беларусь.**

28 лютага ў маскоўскім аэрапорце «Шарамецьева-2» былі затрыманыя два спартоўцы-барцы са зборнай Катару, што ляцелі зь Беларусі ў Сэрбію праз Маскву. У іх нібыта знайшлі незадэклараваную валюту. Пазьней расейскія СМІ падалі інфармацыю, што спартоўцаў абвінавачваюць у «сувязях з тэрарыстамі» і хочуць абмяняць на арыштаваных расейскіх агентаў. Магчымасьць такога абмену падаецца сумнеўнай. Больш верагодным выглядае тлумачэньне, што затрыманых спартоўцаў расейцы меркавалі выкарыстаць у якасьці элементу псыхалягічнага ціску на катарскае кіраўніцтва.

Працяг на старонцы 5.

Валер Булгакаў

# Лукашэнка і газ



**Валер Булгакаў — палітычны і культурны публіцыст, рэдактар часопісу «ARCHE»**

Нядаўняму газаваму канфлікту паміж Расеяй і Беларусяй сродкі масавай інфармацыі давалі ўзаемавыключальныя тлумачэньні. Расейцы былі схільныя бачыць корань усіх бедаў у элемэнтарнай непрыстойнасьці беларускага кіраўніцтва, якое не заключыла новага кантракту з «Газпромам», пайшло на крадзеж чужой уласнасьці і вымусіла Крэмль на рашучыя захады. Расейскія аналітыкі падмацоўвалі гэтае тлумачэньне развагамі пра страшную неэфэктыўнасьць беларускай эканамічнай мадэлі, якая заганяе беларускае кіраўніцтва ў тупік. Яны таксама намякалі, што ціск на Лукашэнку выкарыстоўваецца Крамлём напярэдадні расейскіх прэзыдэнцкіх выбараў для таго, каб заваяваць прыхільнасьці лібэральна настроеных расейскіх выбарцаў, якім Лукашэнка агідны, а Пуцін пакуль нямілы, але якія ўсё-такі могуць за Пуціна прагаласаваць, калі правільна паставіць справу.

Беларускія камэнтатары ўспрымалі канфлікт у залежнасьці ад сваіх ідэалягічных прыхільнасьцяў. Некаторыя зь іх папросту напаўнялі расейскія тлумачэньні мясцовым калярытам. Аглядальнік інтэрнэтрэсурсу «Наше мнение» Андрэй Суздальцаў тлумачыў крызыс ценявой прыватызацыяй беларусамі «Белтрансгазу»: калі на пачатку лютага Міхаіл Касьянаў дазнаўся, што адзін працэнт акцыяў «Белтрансгазу» быў цішком спрыватызаваны працоўным калектывам і невядомымі мінарытарнымі акцыянэрамі, яму нічога не заставалася, як закруціць вэнтыль.

Другія бачылі за ўсім гэтым падкопы антыбеларускіх сілаў і агрэсію супраць нашай маладой незалежнасьці. З выказваньняў дэпутата Касьцяна можна было зрабіць выснову, што гэтыя сілы даўно праніклі ў Крэмль.

Трэцця, а такіх была большасьць сярод журналістаў недзяржаўных расейскамоўных выданьняў, тлумачылі крызыс тым, што культурную, цывілізацыйна вышэйшую Маскву не задавальняе грубы і прыцісклівы беларускі лідэр зь сялян. Адсюль крыўды, канфлікты і псыхалягічная неўраўнаважанасьць.

## Палітыка і парнаграфія

Як гэта часта бывае зь беларускай ці расейскай палітычнай аналітыкай, яна перш-наперш выяўляе культурныя, палітычныя або эканамічныя ідэалы саміх аналітыкаў, а не рэальныя прычынна-выніковыя сувязі рэальнага жыцьця. Адным з такіх ідэалаў, які старанна назвязваецца расейскімі палітычнымі камэнтатарамі і іх тутэйшымі падпяваламі, зьяўляецца ўяўленьне пра Маскву як пра галоўнага дэмакратызатара на прасторах СНД, што вядзе газавыя і іншыя войны ў імя трыюмфу дэмакратыі.

На жаль, яно мае мала супольнага з рэальнасьцю. На расейскіх штыхах трымаюцца самыя адыёзныя рэжымы на постсавецкай прасторы — прыднястроўскі Ігара Сьмірнова або абхаскі Ўладзіслава Ардзінгбы (нядаўна ў Абхазіі пачаўся голад, і Расея паслала туды эшалён з збожжам). Каб задаволіць свае геапалітычныя інтарэсы, расейцы ішлі на распальваньне грамадзянскіх войнаў у былых рэспубліках СССР і зьвяржэньне дэмакратычна выбраных урадаў (Азэрбайджан, Грузія, Таджыкістан), падтрымлівалі сэпаратысцкія рухі і тэрытарыяльнае расчляненьне новых незалежных дзяржаваў (Малдова, Азэрбайджан, Грузія). Сёньня Крэмль аказвае ўсебаковую інфармацыйную, палітычную й эканамічную падтрымку прагніламу і карумпаванаму рэжыму Леаніда Кучмы. І нарэшце, пра сапраўдную вартасьць гэтага ўяўленьня гаворыць той факт, што, згодна зь міжнароднымі ацэнкамі, на прасторы СНД цяпер не існуе ніводнага рэжыму, які б можна было назваць дэмакратычным з пункту гледжаньня адпаведнасьці заходнім стандартам дэмакратыі.

Чаму Крэмль вітае і нават заахвочвае палітычную і эканамічную стагнацыю ў краінах СНД? Таму, што існаваньне ізаляцыяніцка настроеных рэжымаў на гэтай прасторы, у якіх не выконваюцца мінімальныя дэмакратычныя стандарты, пануе прававое бязьмежжа і экстэнсіўныя падыходы да эканомікі, забясьпечвае расейскай палітыцы і бізнэсу асаблівыя правы і магчымасьці. Здаровы заходні, а не афшорны або спэкуляцыйны капітал у такія дзяржавы не ідзе, таму падмацаваны палітычнымі гарантыямі і вайсковымі базамі расейскі бізнэс аказваецца тут у цяплічных умовах. Бо пра сумленную канкурэнцыю з заходнім капіталам ня можа быць і гаворкі. Расейцы з задавальненьнем купляюць нафтапрацоўчыя комлексы, як ва Ўкраіне, або цеплаэлектрастанцыі, як у Арменіі.

Такім чынам працуе прымітыўны мэханізм канвэртацыі палітычнага ўплыву ў эканамічныя дывідэнды ўва ўмовах штучна стрымліванай канкурэнцыі. Зь цягам часу гэта яшчэ больш прывязвае былую рэспубліку СССР да колішняй мэтраполіі і адрывае ад рэшты сьвету.



КАЛЯЖ АРЦЁМА ЛЯВЫ

## Да чаго імкнецца Расея

Калі Расея зацікаўлена ў росквіце ў Беларусі аўтарытарызму, то чаму 18 лютага Пуцін так строга пакараў Лукашэнку?

Вэрсія, што за парушэньне няпісаных правілаў гульні — я табе палітычнае прыкрыцьцё і скрытыя датацыі, ты мне ласыя кавалкі сваёй эканомікі, — не вытлумачвае вастрыні канкрэтнага моманту. Чаму гэта здарылася менавіта цяпер, а не на год раней ці пазьней?

У нас многа сказана пра непадатлівасьць канкрэтных кіраўнікоў «Белтрансгазу» ў перамовах з «Газпромам» і недагаварздольнасьць усяго беларускага кіраўніцтва. Шмат гаворыцца пра спэцыфічнае разуменьне абодвума бакамі паняцьця «нацыянальных інтарэсаў» і груз узаемных прэтэнзіяў. Аднак па-ранейшаму па-за ўвагай застаецца аналіз эвалюцыі расейскай эканамічнай палітыкі апошніх гадоў у дачыненьні да краін СНД.

Неўзабаве пасьля прыходу на прэзыдэнцкую пасаду Ўладзімера Пуціна расейскі ўрад пачынае пры дапамозе яго льготнага падаткаабкладаньня заахвочваць экспарт расейскага капіталу ў краіны СНД, а таксама дамагацца большай адкрытасьці іх рынкаў для расейскіх тавараўвытворцаў. У якасьці праваднікоў эканамічнай экспансіі ў краіны «блізкага замежжа» ён ужывае буйныя напаўдзяржаўныя фірмы накшталт «Газпрому». Характар ключавых эканамічных рашэньняў і стыль мысьленьня пуцінскіх эканамічных дарадцаў гэтай пары недвухсэнсоўна сьведчыць, што Крэмль вырашыў зарабляць на СНД, а не раздаваць эканамічныя датацыі ўзамен на палітычную ляяльнасьць. У Крамлі нарэшце зразумелі, што й палітычнай ляяльнасьці той ці іншай краіны СНД дабіцца значна прасьцей, калі стратэгічныя пляцдармы ў яе эканоміцы ўжо захоплены.

На гэты час, 2001—2002 г., прыпадаюць першыя беларуска-расейскія скандалы. Яны былі выкліканыя зусім не заклапочанасьцю Расеі захаваньнем у Беларусі правоў чалавека, а тым, што беларускі рынак па-ранейшаму заставаўся слаба пранікальным для расейскага капіталу.

Аналіз цяперашняга вітка напружанасьці ў беларуска-расейскіх дачыненьнях паказвае, што апэтыты расейцаў растуць, тым часам як пазыцыя лукашэнкаўцаў мала зьмянілася. Расейцы цяпер хочуць дыктаваць свае правілы ў галіне фінансавай і фіскальнай палітыкі (увядзеньне адзінай валюты паводле расейскага сцэнару, уніфікацыя падатковых ставак і г.д.), кантраляваць транзыт тавараў праз Беларусь, г.зн. беларускую мытню, асноўныя каналы транспартнай камунікацыі (чыгунку, трубаправоды), энэргетычную сыстэму, высокапрыбытковыя сэктары прамысловасьці. Экстрапалюючы беларускі досьвед на ўсе постсавецкія краіны, можна зрабіць выснову, што на нашых вачах ізноў адбываецца круты паварот расейскай эканамічнай палітыкі ў дачыненьні да краін СНД.

## Новая расейская эканамічная палітыка

Пасьля прэзыдэнцкіх выбараў перад Крамлём будзе стаяць адна эканамічная звышзадача — падвоіць расейскі ВУП. У сьвятле апошніх праграмных рашэньняў пуцінскай адміністрацыі вельмі сумнеўна, што яна будзе дасягнута выключна экстэнсіўнымі мэтадамі, г.зн. павелічэньнем здабычы і экспарту мінэральнай сыравіны, іншых тавараў зь нізкай дададзенай вартасьцю. Лёгіка гэтых рашэньняў, у тым ліку газавы шантаж Беларусі, паказвае, што стаўка зроблена на стымуляваньне інтэнсіўнага росту расейскай эканомікі, у прыватнасьці прамысловасьці.

Складаньне палітычных ці эканамічных прагнозаў — рэч няўдзячная, таму мы абмяжуемся апісаньнем толькі тых прынцыпаў новага эканамічнага курсу Крамля ў дачыненьні да краін СНД, якія вымалёўваюцца ўжо цяпер. Крэмль будзе рабіць усё, каб эканомікі СНД стымулявалі эканамічны рост у самой Расеі, а менавіта:

— забясьпечваць устойлівы доступ расейскіх вытворцаў тавараў і паслуг на ўнутраныя рынкі краін СНД. Сукупны рынак гэтых краін сваёй ёмістасьцю амаль роўны ўнутранаму расейскаму. І хаця плацежаздольнасьць і структура спажывецкіх прэфэрэнцый іх жыхароў істотна розьніцца, няхітрыя арытмэтычныя падлікі паказваюць, што гэты кірунак эканамічнай экспансіі можа даць расейскаму бізнэсу сур’ёзныя дывідэнды;

— стымуляваць экспарт расейскага капіталу ў краіны «блізкага замежжа». Напаўразбураныя, структурна дэфэктыўныя эканомікі СНД маюць масу нявыкарыстаных і незапатрабаваных інтэлектуальных, працоўных і вытворчых рэсурсаў, якія можна змусіць запрацаваць пры дапамозе інвэстыцый. Зазначым, што эканамічныя аб’екты ў СНД рэдка цікавяць расейскі бізнэс самі па сабе. Найчасьцей ім наканавана ўключыцца ў якасьці структурнага зьвяна ўва ўжо існыя фінансава-прамысловыя групы і працаваць на расейскую эканоміку;

— гарантаваць расейскаму бізнэсу аднолькавыя рамачныя ўмовы для гаспадарчай дзейнасьці на тэрыторыі СНД. Дамагацца жорсткай уніфікацыі фінансавай, падатковай, транспартнай, мытнай, заканадаўчай і г.д. палітыкі краін СНД.

Канцавой мэтай цяперашняй крамлёўскай адміністрацыі зьяўляецца стварэньне зоны эканамічнай інтэграцыі з жорсткім інстытуцыянальным афармленьнем, г.зн. адзінай валютай, юрыдычнай базай і рамачнымі ўмовамі гаспадараньня, накшталт Эўрапейскага Зьвязу. Толькі ад апошняга гэтую зону будзе адрозьніваць эканамічная несувымернасьць яе ўдзельнікаў і, як вынік, прывілеяванае становішча расейскага капіталу. А эканамічны рост якой-небудзь Беларусі або мадэрнізацыя яе эканомікі будзе цікавіць яго ў апошнюю чаргу.

Пабачыць, ці стане эканоміка СНД дэ-факта працягам расейскай эканомікі, мы зможам ужо скора.

## Чаму Лукашэнка адказаў так моцна

Скандальны адказ Лукашэнкі на расейскі газавы шантаж 19 лютага быў галоўнай тэмай навінаў у Расеі, Польшчы і Беларусі. Даводзілася чуць галасы, якія тлумачылі гэтую эскападу глыбокім крывадушшам беларускага прэзыдэнта, які сумысьле паказное халуйства перад Масквой з унутранай нянавісьцю да яе. Маўляў, вось яно і вылезла вонкі.

Я б хацеў прапанаваць пару думак, што тлумачаць беларуска-расейскі крызыс фактарамі, якія выходзяць за межы псыхалягічных комплексаў і абстрактных эканамічных праграм.

Працяг на старонцы 4.

# Рухі Андрэя Клімава

**Адзін з прэтэндэнтаў на пасаду прэзыдэнта стаўся вядомы на 100% за два з паловай гады да выбараў. 1 сакавіка Андрэй Клімаў прэзэнтаваў рух уласнага імя.**


PHOTO.BYMEDIA.NET

Зрэшты, сам А.Клімаў ня лічыць, што чакаць прыйдзецца да 2006 г. «Думаю, што Лукашэнка папросту не дацягне да 2006 году, бо, давёўшы краіну да спыненьня паставак газу, ён аўтаматычна ператварыўся ў палітычны труп», — кажа ён. Разам з тым А.Клімаў гаворыць аб дзьвюх рэчах, неабходных, каб стаць прэзыдэнтам Беларусі: «Трэба, каб гэтага чалавека не баялася Расея, але ў той жа час баяўся Лукашэнка. На фізычным узроўні». Таму А.Клімаў на панядзелкавай прэзэнтацыі «Руху Андрэя Клімава» падкрэсьліваў, што ён — прарасейскі палітык. Але потым дадаў: «У Эўразьвяз Беларусь і Расея павінны ісьці разам, але не як адзіная дзяржава, а як хаўрусьнікі».

На прэзэнтацыю ў кавярню «Латэ» Клімаў запрасіў практычна ўвесь апазыцыйны палітычны бамонд, і бамонд прыйшоў: Станіслаў Багданкевіч, Васіль Шлындзікаў, Аляксандар Рабатай, Генадзь Бураўкін, Мечыслаў Грыб, Яўген Будзінас, Аляксандар Сасноў, Уладзімер Нісьцюк, Тацяна Процька, Павал Казлоўскі.

А.Клімаў паводзіў сябе разьняволена. Некаторых з гасьцей А.Клімаў акрэсьліваў як мажлівых кандыдатаў у прэзыдэнты, як толькі яны зьяўляліся ў прадпрыемстве грамадзкага харчаваньня. Так былі прывітаныя Міхаіл Чыгір, Міхаіл Марыніч, Мікола Статкевіч, Пятро Краўчанка і Леанід Сініцын. На імправізаваную сцэну ў якасьці стваральнікаў палітычнага руху выйшлі пяць чалавек: сам А.Клімаў, ягоны сябар-журналіст Яўген Агурцоў, тэлежурналіст Леанід Міндлін, былы прадпрымальнік і данядаўна лідэр «Свабоднай Беларусі» Леанід Малахаў, а таксама малады чалавек Цімох Дранчук, які прыпыніў сваё сяброўства ў «Зубры».

Адразу ж было сказана, што ўсялякія аналёгіі зь іншай «Пяцёркай» тут выпадковыя. А ў якасьці «плюсу» анансавалі фуршэтныя сталы з ікрой і рыбай. Л.Міндлін зазначыў, што «ўсялякая гіпотэза можа ажыцьцявіцца, толькі калі яна крыху вар'яцкая». Візуальнай і гукавой сымболікі не было.

Будучы кандыдат настойваў, што мае права балятавацца на прэзыдэнта, зыходзячы з таго, што ў судовым прысудзе, агалошаным 17 сакавіка 2000 году, не было адмысловага пункту, які б забараняў яму пасьля вызваленьня займаць пасады ва ўладзе. Нарадзіўся ён таксама так, як трэба, — у Менску. Каб яго маглі зарэгістраваць, А.Клімаў мусіць кампэнсаваць дзяржаве суму вызначанае судом «шкоды». А.Клімаў кажа: «Гэты «выкуп» за мяне ўнясуць». Хто? «Сябры-расейцы».

На пытаньне, навошта яму ўвогуле прэзыдэнцтва як такое, адказаў, што ягоная мэта «выходзіць далёка за прыватныя амбіцыі» ды палягае ў дзьвюх задачах: паляпшэньне дабрабыту беларусаў і зьмена іміджу краіны ў сьвеце на пазытыўны.

**Зьміцер Дрыгайла**

## ХРОНІКА АПАЗЫЦЫІ

**Намесьніцу рэдактара «Белорусской деловой газеты» Ірыну Халіп** 26 лютага выклікалі ў Менскую пракуратуру. Узнаўляецца крымінальная справа паводле ейнай публікацыі «Аўганскія харты» ў «БДГ. Для служебного пользования». Судзілі і старшыню РГА «Пэрспэктыва» **Анатоля Шумчанку.** Яго вінавацілі ў арганізацыі несанкцыянаванага мітынгу. 24 лютага ён па прыватных справах быў на рынку «Ўручча-3», дзе да яго падыходзілі прадпрымальнікі з пытаньнямі. 3 сакавіка суд спыніў справу дзеля адсутнасьці складу злачынства. 27 лютага заснавальнікі фонду **«Ратуша»** (сябры ліквідаванага ў лістападзе 2003 г. ГА «Ратуша») падалі ў суд скаргу на адмову Гарадзенскага гарвыканкаму ў рэгістрацыі. Управа юстыцыі Менгарвыканкаму вынесла пісьмовае папярэджаньне гарадзкому грамадзкаму аб'яднаньню **«Дыярыюш»**, бо адзін зь сяброў Рады пражывае ня ў горадзе, а ў Менскім раёне. 1 сакавіка ў Горадні на базавую велічыню быў аштрафаваны адзін зь лідэраў прадпрымальніцкага руху Зьміцер Іваноўскі: 29 лютага яго затрымалі падчас распаўсюду ўлётак з заклікам прыйсьці на мітынг прадпрымальнікаў. Судзьдзя Вера Тупік 1 сакавіка дала газэце **«Народная воля»** 15 млн руб. кары. Грошы пойдуць прадпрымальніку Сяргею Атрошчанку як кампэнсацыя за маральную шкоду ад артыкулу Марыны Коктыш «Якому бізнэсу ў Беларусі добра?». Суд Першамайскага раёну Менску пачаў разгляд пазову **Беларускага Хельсынскага камітэту** і яго старшыні **Тацяны Процькі** да Нацыянальнай дзяржаўнай тэлерадыёкампаніі, вядучага тэлепраграмы «Ў цэнтры ўвагі» Сяргея Хамянтоўскага і аўтара яе тэксту Сяргея Пракопава. 2 лістапада 2003 г. у праграме быў паказаны нэгатыўны сюжэт пра БХК, Т.Процьку і іншых праваабаронцаў, які НДТРК адмовілася абвергнуць.

**АШ**

# Лукашэнка і газ

**Працяг са старонкі 3.**

**Тлумачэньне першае.** Самымі дагавараздольнымі з расейскага пункту гледжаньня зьяўляюцца палітычна самыя слабыя прэзыдэнты краін СНД, гатовыя паглыбляць структурную залежнасьць эканомікі сваёй краіны ад Расеі ўзамен за расейскую палітычную падтрымку. Беларускае грамадзтва пакуль не ўвашло ў фазу эканамічнага крызысу, таму беларускі прэзыдэнт кажа расейцам усё, што хоча.

**Тлумачэньне другое.** Лукашэнка вось ужо дзесяць гадоў гуляе на расейскім палітычным полі. З кім толькі ён ні ўступаў у кантакты за гэты час — і з расейскімі губэрнатарамі, зь сілавікамі, нацыянал-патрыётамі і акадэмікамі. Пры хворым Ельцыну такія кантакты прынамсі талераваліся, пры энэргічным і самаўладным Пуціну яны ўспрымаюцца як выклік расейскай дзяржаве. Адсюль адключэньне газу — апошні сымбалічны акт у справе выгнаньня Лукашэнкі з расейскай сыстэмнай палітыкі, які выклікаў у яго глыбокае ўзрушэньне і нават злосьць.

**Тлумачэньне трэцяе, эканамічнае.** Беларусь самая палітычна і эканамічна інтэграваная з Расеяй краіна СНД. Зусім натуральна, што менавіта тут, на пярэднім рубяжы інтэграцыі, першымі адчулі, што расейцы кардынальна мяняюць правілы гульні. Таксама зразумела, што Лукашэнку і яго паплечнікам не падабаецца, калі іх краіна выкарыстоўваецца як палігон для апрабацыі новых расейскіх падыходаў да былых братніх краін. Калі гэтае тлумачэньне мае прагнастычную сілу, трэба чакаць, што расейцы захочуць паставіць Беларусь на калені, каб даць пераканаўчы ўрок усім палітычным лідэрам краін СНД: супраціў бессэнсоўны.

> Беларусь і Расея маюць адрозныя шляхі да эканамічнага росту. І пакуль Лукашэнка будзе адстойваць нашы нацыянальныя інтарэсы хаця б у эканамічнай сфэры, ён будзе мець палітычную будучыню.

**Тлумачэньне чацьвертае, папулісцкае.** Справядліва заўважана, што Лукашэнка заўсёды чуйна прыслухоўваецца, што гаворыць і чаго хоча беларускі народ. Дзесяць гадоў таму яго эліта, беларускі дырэктарат, хацела толькі аднаго: разбурыць мяжу з Расеяй, аднавіць разарваныя гаспадарчыя сувязі і заваяваць расейскі рынак. За дзесяць гадоў дырэктарат працверазеў, звыкся зь беларускай незалежнасьцю і цяпер страшна баіцца, каб сюды не прыйшоў расейскі капітал і не павыганяў яго з наседжаных месцаў. Гэтыя страхі ўмела падаграваюць беларускія протаалігархі, якія ўспрымаюць нацыянальную незалежнасьць Беларусі як абавязковую ўмову для стабільнасьці свайго бізнэсу. Такім чынам, Лукашэнка сьмела ідзе на канфлікт з Крамлём, бо адчувае, што за ім народ.

**Тлумачэньне пятае.** Усе цудоўна ведаюць, што Лукашэнка заклапочаны сваёй палітычнай будучыняй. Ён і ўся яго адміністрацыя толькі і думаюць, як арганізаваць яго элегантнае пераабраньне на трэці тэрмін. Летась яны нарэшце знайшлі былі такі спосаб. Меркавалася, што, калі адобраны беларускім і расейскім прэзыдэнтамі канстытуцыйны акт саюзнай дзяржавы будзе вынесены на рэфэрэндум, у беларускія бюлетэні для галасаваньня будзе дадзена пытаньне пра падаўжэньне тэрміну паўнамоцтваў Лукашэнкі. Але расейцы пачалі торг, апатэозам якога быў газавы спэктакль 18—19 лютага. Раз вы плюнулі на нашы папярэднія дамоўленасьці, падумаў беларускі прэзыдэнт, я плюну на вас саміх. І плюнуў.

На карысьць гэтай вэрсіі гавораць шматлікія адзнакі таго, што Лукашэнка сам ішоў на абвастрэньне канфлікту. Значыць, яго падштурхоўвала нейкая абсалютная матывацыя. Калі Лукашэнкам рухала воля да трэцяга тэрміну, гэта азначае, што пакуль Расея ня дасьць надзейных гарантыяў сваёй нэўтральнасьці на прэзыдэнцкіх выбарах 2006 г., любы мір зь ёй будзе толькі замірэньнем. У такім выпадку чакаем эскаляцыі канфлікту.

**Тлумачэньне шостае.** Лукашэнка — унікальны прэзыдэнт, а Беларусь — вынятак з агульнага правіла, што на постсавецкай прасторы выбары існуюць толькі для таго, каб афармляць пераемнасьць улады. У 1994 г. у Беларусі да ўлады прыйшоў палітык, які ня меў намэнклятурнага мінулага і кліенцкіх абавязкаў перад сваімі закулісьнымі патронамі. Складнікамі яго посьпеху былі палітычны папулізм, ідэалягічны эклектызм і здольнасьць выказваць свае думкі на даступнай вуліцы мове. На ўзроўні сваёй аратарскай манеры Лукашэнка й цяпер застаецца палітыкам вуліцы, якая й прывяла яго на вяршыню ўлады. Таму няма нічога дзіўнага, што ў сваіх палітычных прамовах ён ня робіць асаблівага адрозьненьня паміж якім-небудзь Пуціным і якім-небудзь Пётухам.

## Ці мае Лукашэнка будучыню

Тутэйшыя і маскоўскія аналітыкі асабліва агрэсіўна навязваюць дзьве ідэі. Адна зь іх разглядае нашу эканоміку як надзвычай адсталую, другая пераконвае нас, што Крэмль мае досыць сродкаў у сваім распараджэньні, каб дыктаваць сваю палітычную волю ўсім рэжымам «блізкага замежжа».

Абедзьве яны зьяўляюцца гранямі аднаго вялікага постімпэрскага міту, які нараджаецца на нашых вачах. Гэты міт настойвае на звышпаўнавартасьці Расеі і непаўнавартасьці ўсіх сумежных зь ёй тэрыторый. Для яго папулярызатараў любыя «мясцовыя» эканомікі блякнуць перад веліччу расейскай эканамічнай магутнасьці, а рука Масквы прасьціраецца на сушу, ваду і калязямную прастору.

Аднак, калі меркаваць па ўзроўні аплаты працы, наша эканоміка застаецца адной з самых эфэктыўных у СНД. Сярэдні беларус зарабляе ўдвая больш за сярэдняга ўкраінца. Па велічыні заробтнай платы мы прайграем Расеі і Казахстану, але апярэджваем усе іншыя краіны СНД, эканамічны дабрабыт якіх не грунтуецца выключна на экспарце сыравіны. І што самае важнае, наша эканоміка збалянсаваная для ўнутраных патрэб, а нацыянальная эканамічная палітыка ўнікае нэакаляніяльнага эканамічнага партнэрства.

Нядаўні газавы шантаж — гэта толькі лякальны эпізод буйнамаштабнага канфлікту нацыянальных інтарэсаў Беларусі і Расеі, які тлее ўжо некалькі гадоў. Ён яшчэ раз упэўніў нас, што Беларусь і Расея маюць уласныя і глыбока міжсобку адрозныя шляхі да эканамічнага росту і матэрыяльнага дабрабыту. І пакуль Лукашэнка будзе так адстойваць нашы нацыянальныя інтарэсы хаця б у эканамічнай сфэры, ён будзе мець палітычную будучыню.

За незалежнасьць трэба змагацца. Не бывае незалежнасьці лёгкай.

# Расея мяняе беларускіх грамадзянаў на расейскіх агентаў

Працяг са старонкі 2.

Сэнсацыяй сталася тое, што абодва «катарцы», Ібад Ахмедаў і Аляксандар Дуброўскі, пры праверцы аказаліся грамадзянамі Беларусі.

У панядзелак у гэтым яшчэ былі пэўныя сумневы. Рэч у тым, што Ахмедаў падарожнічаў з катарскім пашпартам і, паводле інфармацыі дарадцы пасольства Беларусі ў Расеі Івана Карэнды, у такім разе мусіў разглядацца як грамадзянін Катару, бо «беларускае заканадаўства не прадугледжвае двайнога грамадзянства». Аднак у аўторак прэс-сакратар Міністэрства замежных справаў Андрэй Савіных унёс яснасьць: Ібад Ахмедаў «зьяўляецца грамадзянінам Беларусі і яму будзе аказана неабходная прававая і консульская дапамога. Ахмедаў застаецца грамадзянінам Беларусі да зьдзяйсьненьня працэдуры выхаду з грамадзянства, якой ён пакуль не рабіў». Катарскага пашпарта Ахмедава ў такой сытуацыі беларускае МЗС не прызнае і мае на гэта законныя падставы.

У аўторак зьявілася непацьверджаная інфармацыя, што Ібад Ахмедаў ужо вызвалены. МЗС Беларусі, аднак, нічога наконт гэтага паведаміць ня мог. Невядомым засталося і месца ўтрыманьня беларускага грамадзяніна ў Маскве. Магчыма, ён правёў колькі дзён на Лубянцы. У прэс-службе ФСБ Расеі карэспандэнту «НН» паведамілі, што «ў іх няма ніякай інфармацыі» пра затрыманьне ў Маскве беларускіх грамадзянаў. «А хто такі Ібад Ахмедаў?» — пацікавіўся супрацоўнік прэс-службы, нібыта не азнаёмлены з сытуацыяй.

Аляксандар Дуброўскі, паводле слоў Андрэя Савіных, меў беларускі пашпарт, не затрымліваўся расейцамі ды цяпер знаходзіцца ў Катары. Паводле іншых зьвестак, Дуброўскага ўсё ж затрымлівалі разам з Ахмедавым, але ненадоўга, і вызвалілі з прабачэньнямі за ўчыненыя «нязручнасьці». Расейцы не прадбачылі, што і ягоны падапечны акажацца грамадзянінам Беларусі. Паведамленьням пра затрыманьне ў Маскве мужа пярэчыць Ала Дуброўская, якая жыве ў Менску. Паводле яе, разам з Ахмедавым быў затрыманы супрацоўнік спорткамітэту Катару. «Катарцы — вельмі самаўпэўненыя людзі, таму яны і паехалі праз Маскву», — сказала яна карэспандэнту «НН».

Са словаў кіраўніка Беларускай фэдэрацыі клясычнай барацьбы Аляксандра Мядзьведзя, Дуброўскі працуе ў Катары ўжо каля 8 гадоў. Гэты былы прызёр чэмпіянату Эўропы даўно займаецца трэнэрскай працай. У Катар ён патрапіў з Сырыі. У Беларусі ў яго засталася сям'я.

Ібад Ахмедаў — азэрбайджанец, выхаванец Дуброўскага, у сярэдзіне 90-х выступаў за нацыянальную зборную Беларусі. Праўда, добрымі вынікамі гэты мухач з вагавай катэгорыі да 54 кг не вызначаўся і пасьля Алімпіяды-96 застаўся «незапатрабаваным». Гады два таму Ахмедава запрасіў у Катар ягоны былы трэнэр Дуброўскі. Сёлета ў Ахмедава зьявіўся шанец ізноў патрапіць на Алімпіяду ўжо ў складзе зборнай гэтай невялічкай арабскай краіны. Дзеля гэтага яму трэ было патрапіць у пяцёрку найлепшых на кваліфікацыйным турніры ў Сэрбіі. Аднак выступу перашкодзілі расейскія спэцслужбы. Фатальнай аказалася адсутнасьць простага транспартнага злучэньня між Беларусяй і Сэрбіяй — дзьвюма краінамі, якія пяць гадоў таму спрабавалі аб'яднацца ў саюзную дзяржаву.

Аляксандар Мядзьведзь кажа, што ў Катары працуе шмат спартоўцаў-сілавікоў зь Беларусі. Час ад часу яны бываюць на Бацькаўшчыне, праводзяць на нашай базе зборы. Некаторыя зь іх неўзабаве прыедуць у Менск для ўдзелу ў традыцыйным турніры на прызы Аляксандра Мядзьведзя.

Менавіта гэтыя спартоўцы прывозілі ў Беларусь фінікі для беларускіх сяброў Зелімхана Яндарбіева. Зь Беларусі ж, як расказваюць гэтыя сябры, што пажадалі застацца невядомымі, Яндарбіеву за некалькі месяцаў да ягонай гібелі перадалі пяць боханаў чорнага хлеба.

Спартоўцы з Катару жылі ў менскім гатэлі «Аквабел». Зьвесткі пра спартоўцаў з арабскае дзяржавы, якія маюць кантакты зь Яндарбіевым, нейкім чынам патрапілі да расейскіх спэцслужбаў. Аднак з затрыманьнем двух беларускіх грамадзянаў ФСБ, падобна, села ў лужыну.

**Сяргей Ёрш**

# «Курьер», «Навіны», «Гоман» і «Адзінства»

## Барысаўскі мэдыя-рынак

Кожны, хто зазірне ў барысаўскія газэтныя шапікі, убачыць там чатыры мясцовыя выданьні. Тры незалежныя і адно афіцыйнае.

Найбольшай папулярнасьцю карыстаюцца незалежныя «Барысаўскія навіны» і «Курьер из Борисова». Тэрыторыя распаўсюду іх не абмяжоўваецца нашым горадам, а ідзе далей — Жодзіна, Крупкі, Смалявічы. Супольны наклад двух выданьняў вагаецца ў межах 25 тысячаў, што для 150-тысячнага Барысава неблагі вынік. Памер «Навінаў» 24 старонкі, а «Курьер» днямі перайшоў на 40 старонак замест ранейшых 32. Большую частку аб'ёму газэтаў займаюць тэлепраграма і бясплатныя рэклямныя абвесткі — дзякуючы ім, у прынцыпе, газэты і карыстаюцца такім попытам. Апроч агульнанацыянальных каналаў і мясцовага «СкіФу» друкуецца расклад праграмаў кабэльнага ТБ. Значную частку матэрыялаў складае рознага кшталту забаўляльшчына — крыжаванкі, показкі, астралягічныя прагнозы і г.д.

«Курьер из Борисова» ў асьвятленьні палітычнага жыцьця краіны аддае перавагу артыкулам з інтэрнэт-выданьня «Белорусские новости», і толькі пра гарадзкія падзеі пішуць ужо мясцовыя журналісты.

Засмучае ў барысаўскіх выданьнях іх расейскамоўнасьць. Матэрыялы па-беларуску на старонках «Курьера» зьяўляюцца гады ў рады. Хоць, калі зьяўляюцца, то зусім неабавязкова «афіцыйным» правапісам. Тарашкевіца таксама часам прысутнічае на старонках выданьня. На лягатыпе «Барысаўскіх навінаў» зьмешчаны дзьвюхмоўны надпіс, хоць «дзьвюхмоўе» ў газэце ці ня цалкам зьнікла ад Новага году. Перавага была аддадзена мове расейскай. Засмучае яшчэ і тое, што пішуць па-расейску ў гэтых выданьнях аўтары «Нашай Нівы», радыё «Свабода».

Зусім іншая сытуацыя ў беларускамоўнай газэце «Гоман Барысаўшчыны», якую выдаюць і прапагандуюць сябры ТБМ, а ў прыватнасьці выкладчык тутэйшага Палітэхнікуму Міхал Мацельскі. Ён чытае лекцыі па тэхнічных дысцыплінах па-беларуску і ставіць дадатковыя балы навучэнцам, якія адказваюць таксама па-наску.

Газэта выходзіць раз на месяц і для такога выданьня каштуе сьмешныя грошы. У выходных зьвестках пазначана: «Гоман Барысаўшчыны. Грамадзка-палітычная, асьветніцкая газэта». Хоць палітыкі на старонках «Гоману» няма. Можа, тое і да лепшага. Газэта піша пра эканоміку, гаспадарку, культурнае ды грамадзкае жыцьцё гораду і ваколіцаў, спорт. Але асноўная стаўка робіцца на гісторыю, этнаграфію, краязнаўства, фальклёр. Найбольшую цікавасьць сярод матэрыялаў газэты выклікае выклад «Гісторыі Барысаўшчыны ад старажытных часоў да сучаснасьці» ад сп.Мацельскага, што з 96-га друкуе газэта. Газэту робяць не прафэсійныя журналісты, а проста людзі, апантаныя беларускай справай. Рэдакцыя актыўна вандруе па раёне, прапагандуючы сваё выданьне, вывучаючы гісторыю мясьцінаў. Шкада, што яшчэ не дабраліся да маёй Кастрыцы.

Яшчэ адно выданьне, якое можна набыць у барысаўскіх шапіках, — гэта дыназаўр мясцовых мас-мэдыяў, раёнка «Адзінства», што выходзіць з 1918 г. Газэту ў асноўным чытаюць пэнсіянэры ў вёсках, а яе наклад зьніжаецца. Што цікава, у адным зь леташніх нумароў «Адзінства» «Наша Ніва» была названая «дзіцячай газэтай» у простым сэнсе.

Сярод самвыдавецкіх праектаў вылучаецца «Афсайд». Папросту файнае спартовае/футбольнае выданьне. Аднак цікавасьць да «Афсайду», паводле спэцыфікі газэты, выяўляе толькі пэўная група барысаўцаў. А ў вёсках «Афсайду» не набыць. Астатнія «дзьвесьце дзевяноста дзявяткі» неяк не засталіся ў памяці. Яны ствараліся да агульнанацыянальных падзеяў, накшталт выбараў, таму і былі запраграмаваныя на недаўгавечнасьць. Запомнілася толькі навасадская моладзевая газэта «Павятовы летапіс», бо трапляла ў Кастрыцу. Аднак, здаецца, на чацьвертым нумары выданьне зьнікла.

Які-ніякі, а выбар на рынку барысаўскіх мас-мэдыя ёсьць. І гэта радуе. Хоць хацелася б трохі болей беларускай мовы і палітычнай аналітыкі.

**Зьміцер Панкавец, Кастрыца**

### Новыя аўтанумары

**Праз два тыдні ў Менску пачнуць выдаваць аўтамабільныя нумары новага ўзору.** Яны будуць чорнымі на белым тле. Дадатковая лічба будзе пазначаць прыналежнасьць аўто да рэгіёну. Менску далі лічбу 7, Берасьцейшчыне — 1, Віцебску — 2 і далей паводле альфабэту. Міліцыя і памежнікі атрымаюць такія ж чорна-белыя нумары, як і ўсе астатнія кіроўцы. Бела-чырвоныя нумары былі ўведзеныя, калі нацыянальны бел-чырвонабелы сьцяг меў статус дзяржаўнага. Новы нумар будзе каштаваць 17 тыс. рублёў. Пакуль мяняць нумары будзе неабавязкова.

### З лукамолу ў «зубры»

**120 сяброў БРСМ з Баранавіцкага каледжу лёгкай прамысловасьці арганізавана перайшлі ў незарэгістраваны «Зубр» і заклікалі ўсіх браць зь іх прыклад.** 3 сакавіка ў Баранавічы сьпешна прыехаў кіраўнік БРСМ Міхаіл Орда.

### З мабільнікаў праз 017

**Ад 15 сакавіка з мабільнікаў на менскія нумары можна будзе тэлефанаваць толькі праз код 8-017.** Міністэрства сувязі тлумачыць гэта хуткім ростам колькасьці абанэнтаў. Сёлета «Вэлкам» і «МТС» спадзяюцца набраць па мільёну карыстальнікаў, таму нумароў зь іх кодамі 0296 і 0297 ужо ня хопіць. «Вэлкаму», акрамя «шасьцёркі», выдаткавалі «тройку», а «МТС» — «пяцёрку». А ў прыгарадах Менску нумары таксама пачынаюцца на 5. Каб не было блытаніны, выдаткавалі ўвесьці абавязковы набор міжгародніх кодаў.

### Я люблю Ліцэй-2

**Вучні Беларускага ліцэю ў сярэдзіне красавіка выпусьцяць другі дыск сваіх песень.** На новым кампакце будзе 19 песьняў на ліцэйскія й агульнабеларускія тэмы. Некалькі твораў з новага альбому ліцэісты прэзэнтуюць на Дзень Волі.

**МБ; радыё «Свабода»**

### Гвалтоўная падпіска

**Не зважаючы на высілкі райвыканкаму, крычаўцы ўпарта не жадаюць падпісвацца на рэкамэндаваныя «зьверху» выданьні.** У выніку адмысловых мерапрыемстваў райвыканкаму, у канцы 2003 г. наклад «Ленінскага клічу» ўзьняўся адразу з 2900 да 3900 асобнікаў. Аднак сёлета толькі за студзень зьменшыўся на 400 шт. Відавочна, што чатырыста крычаўцаў падпісаліся на «раёнку» пад ціскам адміністрацыі, але толькі на месяц.

Намесьнік старшыні райвыканкаму Сяргей Марозаў запатрабаваў ад кіраўнікоў прадпрыемстваў забясьпечыць неабходную колькасьць падпісчыкаў сярод падначаленых.

**Кацярына Яленская, Крычаў**

### Новы сябар «Дзеднава»

**Працоўным наваствораная ЗАТ «Беларуская піваварная кампанія» прадставілі генэральнага дырэктара, югаслава Прэдрага Фрактыча.** Заснавальнікамі новай кампаніі сталі ААТ «Піваварны завод Дзеднава» і амэрыканская кампанія «Detroit-Belarus Brewing Company LLC». Кантрольны пакет акцый атрымалі амэрыканцы, якія сплацілі значную частку запазычанасьці «Дзеднава». Бліжэйшым часам плянуецца правесьці рэканструкцыю, якая дазволіць павялічыць магутнасьць бровару да 10 млн дэкалітраў у год. Да восені прадпрыемства будзе выпускаць прадукцыю са старым брэндам «Дзеднава», пасьля пачнецца раскрутка новага — «Сябар».

**Данута Чыгір, Магілёў**

### «Шайбу» на мыла

**Летась аршанская міліцыя за парушэньне антыалькагольнага заканадаўства прыцягнула да адказнасьці амаль пяць тысяч чалавек, або кожнага 25-га месьціча.** Найбольш небясьпечнай у гэтым сэнсе зьяўляецца ў Воршы кавярня «Замкавая». Гараджанам яна вядомая пад назвай «Шайба» — празь яе выгляд. Летась тут было затрымана 237 грамадзянаў, якія не трымаліся на нагах, і зьдзейсьнена восем розных злачынстваў. Міліцэйскае кіраўніцтва двойчы прапаноўвала гарвыканкаму зачыніць кавярню або хоць абмяжаваць час яе працы да 23-й. Асабліва спадзяваўся ГУУС на станоўчае рашэньне яшчэ дзеля таго, што літаральна за дзесяць мэтраў месьціцца Сьвята-Міхайлаўская царква. А спрадвеку культавыя й піцейныя ўстановы побач не існавалі. Але калі й зачыняць «Шайбу», праблема п'янства ды алькагалізму кардынальна ня вырашыцца.

### Разьвіталіся зь зімой

**У апошні дзень лютага ў Воршы ладзілася традыцыйнае гарадзкое сьвята «Праводзіны зімы».** Усё было як заўсёды: народ сьпяваў і скакаў, гарэлка й піва ліліся ракою, смажыліся шашлыкі й пякліся бліны. Адно толькі зьдзіўляе, што сьвята адбываліся ў дні Вялікага посту, першы тыдзень якога — адзін з самых строгіх. Відаць, у краіне жыве не адзін праваслаўны атэіст.

### Нетрывалыя дахі

**Апошнія сьнежныя зімовыя дні нарабілі ў Воршы шкоды.** Ня вытрымалі цяжару сьнегу дахі некаторых помнікаў даўніны. Абвалілася частка даху адната з жылых будынкаў Куцеінскага Богаяўленскага манастыру. Пасьля пажару 1997 г. ён мае выгляд, як пасьля вайны 1654—67 г. Сродкаў на аднаўленьне помніка гісторыі й культуры, у якім некалі працавала друкарня Сьпірыдона Собаля, ні царкоўнае, ні сьвецкае начальства пакуль не знайшлі. Прыйдзецца рамантаваць і дах двухпавярховага дому пачатку XX ст., што месьціцца ў цэнтры гораду на вуліцы Менскай. Будынак пакуль законсэрваваны, але сюды плянуе пераехаць аддзел па барацьбе з арганізаванай злачыннасьцю. А ў іх, трэба меркаваць, грошы на рамонт знойдуцца.

**Яўген Жарнасек, Ворша**



PHOTO.BYMEDIA.NET

# На мове адзеньня

Сёлета споўнілася б 60 гадоў этнографу й мастацтвазнаўцу Міхасю Раманюку. Ён нарадзіўся на поўдні, у вёсцы Кавалі, што на Брагіншчыне. А дзяцінства правёў у Цэнтральнай Беларусі — на Койданаўшчыне, у Старынках. З паваеннага маленства засталася зь ім любоў да вялікай роднай краіны. З тых часоў ён вычуваў яе самавітае багацьце, што тоіцца ў мовах, сьпевах, невынішчальных памкненьнях людзей да хараства.

Па сканчэньні Тэатральна-мастацкага інстытуту ў 1971 г. Міхась Раманюк стаў выкладчыкам у ім. Стварыў і ачоліў тым часам часопіс «Мастацтва». Сёньня нават не да галавы пытаньне: што было б безь яго?.. Міхась Раманюк, імпэтны й адказны чалавек, кіраваў нашмат большымі справамі, чым мог сабе ўявіць пры жыцьці.

Ён меў адукацыю мастака-мадэльера, што перадвызначыла мастакоўскія зацікаўленьні. Менавіта гэтак ён сам і напісаў у прадмове да кнігі «Беларускія народныя строі», назваўшы яе справаю свайго жыцьця.

Новае выданьне адкрывае нам сьвет Раманюка-мастака: размаітыя кампазыцыі, упэўненыя абрысы, тонкая дэталізацыя. З тактоўнай іроніяй, зь любасьцю вытвараныя ўсе пэрсанажы. Не манэкены ў мадэлях. Людзі, свае, у сваістых строях. Выданьне ўклаў сын Раманюка, Дзяніс, а зрэдагаваў Сяргей Дубавец.

Тэматыка кнігі становіцца экзатычнаю ў Беларусі. Тую работу, якую зрабіў Міхась Раманюк, болей ня зробіць ніхто, якімі б шчодрымі талентамі ён ні быў адораны. Няма болей тых вёсак на Брагіншчыне, Лоеўшчыне й Камарыншчыне, што добра былі ведамыя Міхасю Раманюку. Зьлятаюць, бы ў вырай, колішнія традыцыі ды ўмельствы. Толькі асобныя артэфакты, што засталіся ў нашых руках, прамаўляюць да нас на сваёй патаемнай мове.

**Сяргей Харэўскі**

Міхась Раманюк. Беларускія народныя строі: альбом. — Уклад. Дзяніс Раманюк.



## «Оскар» за фільм пра Беларусь

**Дакумэнтальная стужка «Чарнобыльскае сэрца» пра наступствы Чарнобылю ў Беларусі атрымала найвышэйшую ўзнагароду Амэрыканскай кінаакадэміі.** 38-хвілінны фільм зьняла незалежная амэрыканская рэжысэрка Марыян Дэлео. Ёй дапамагала ірляндзкая дабрачынная арганізацыя «Чарнобыльскі дзіцячы праект». Карціна ішла ў намінацыі за найлепшую кароткамэтражную дакумэнтальную стужку.

У Беларусі фільму «Чарнобыльскае сэрца» яшчэ ня бачылі, нават у беларускім прадстаўніцтве ірляндзкага фонду.

Марыян Дэлео перамагла дакумэнтальныя фільмы пра жанчыну з Ганы, што шукае палітычнага прытулку ў ЗША, ды на тэму жаночых праблемаў у Амэрыцы. Стужка праходзіла ў конкурсе як беларуска-амэрыканская супрадукцыя. Гэта другі ў гісторыі «Оскараў» фільм, што праходзіў як беларускі.

## Галерэя «Эрмітаж»

**4 сакавіка ў Менску (вул.Сьвярдлова, 4) адчынілася новая прыватная галерэя «Эрмітаж».** Яе гаспадарамі — мастак Андрэй Смаляк і яговая мэнэджэрка Вольга Сычык. Першая выстава — карціны Андрэя Смаляка. Сярод наступных экспазыцый будзе выстава Алены Адамчык.

## Абасава ў «Крамбамбулі»

**«Крамбамбуля» знайшла сабе вакалістку азіяцкага выгляду.** Сьпявачку завуць Гюнэш Абасава, яна родам з Баранавічаў, карані ж мае азэрбайджанска-турэцкія. «Я раней чула пра «Крамбамбулю», але ніколі не разумела такой музыкі. А тут хлопцы далі паслухаць, і мне раптам закарцела», — сказала сьпявачка ў інтэрвію «Комсомолке».

## Караткевіцкі «Скарб»

**У Віцебскім тэатры «Лялька» 28 лютага адбылася прэм'ера спэктаклю «Забыты скарб».** У двухактовай дзеі паводле казкі Караткевіча «Чортаў скарб» занятыя як акторы, так і лялькі, зробленыя ў чалавечы рост. У траўні «Лялька» прэзэнтуе спэктакль «Піліпка і ведзьма» паводле п'есы Сяргея Кавалёва.

## «Сябры» ў Крамлі

**5 сакавіка ў Крамлёўскім палацы ансамбль «Сябры» дасьць канцэрт да 30-годзьдзя.** Упершыню назва «Сябры» прагучала ў 1973 г., яе прыдумаў матор праекту — Анатоль Ярмоленка. Асновай ансамблю былі выпускнікі Гомельскай музвучэльні імя Сакалоўскага.

**МБ; БелаПАН**

# На «Рок-коле»
## дзьве песьні па-беларуску

Арганізатар «Рок-кола» Сяргей Анішчанка мае дваіх дзяцей: малодшаму некалькі месяцаў, старэйшаму, «Рок-колу», — 14 гадоў. Сёлета фэст даўся Анісу асабліва цяжка. Лепшыя часы «Рок-кола» згінулі разам зь «Мясцовым часам». Сум па легендарнай камандзе адчуваўся цягам двух фэстывальных дзён. Ляўрэатаў сярод двух дзясяткаў удзельнікаў вызначыць было цяжка. Зборшага гэта былі пачаткоўцы: ніякіх адметнасьцяў і расейская мова. Прагучалі ўсяго дзьве песьні па-беларуску. «Спадчына, я цябе кахаю», — прараўлі панкі з «Агоніі», ды «J-Морс» засьпявалі мэлядычную «Глядзі». Пераможцамі сталі групы «Фляўс і Кляйн» — рокапопс з налётам «Radiohead», «Skimen», якія паклалі тэксты пра Бога ў сэрцы на гардкоравую музыку, ды «Expansy» з джаз-кампазыцыяй. Апошні гурт існуе ўсяго два тыдні, быў створаны да «Рок-кола». Запомніўся выступ ВІА «Бела Росы» — гэтыя полацкія «Самацьветы» зьявіліся на сцэне ў інвалідных вазках і на мыліцах.

**Сяргей Будкін**

# «Вялес» — Васючэнку

***Ляўрэатам прэміі Таварыства вольных літаратараў «Гліняны Вялес» за 2003 г. стаў Пятро Васючэнка, аўтар кнігі казак «Жылі-былі паны Кубліцкі ды Заблоцкі».*** На прэмію сёлета намінаваліся таксама празаікі Сяргей Рублеўскі (зборнік «Азярод»), Вольга Гапеева («Рэканструкцыя неба»), паэты Валянціна Аксак («Віно з Каліфорніі») і Янка Лайкоў («Вогнепаклоньнік»).

Адзін зь сяброў журы Сяргей Шыдлоўскі тлумачыць выбар так: «Васючэнка — прадаўжальнік лініі Яна Баршчэўскага ў літаратуры, паўночнабеларускай і міталягічнай. Васючэнка адчувае мэйнстрым. Ён можа быць забаўляльным у сваіх творах, але пры гэтым не губляе сэнсавай глыбіні».

Кніга пераможцы выйшла ў дзяржаўным выдавецтве, як і зборнік Лайкова. Астатнія друкаваліся ў прыватных фірмах. У новым стагодзьдзі гэта першая перамога дзяржаўнага выдавецтва. Папярэднія гады кнігі дзяржвыдавецтваў нават не траплялі ў шорт-ліст. Пераможцам у 2001 г. быў Віктар Сьлінко («Штольні вясны», «Беларускі кнігазбор»), а ў 2002 г. — Альгерд Бахарэвіч («Практычны дапаможнік па руйнаваньні гарадоў», «Логвінаў»).

**АВ**



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

# Новыя энцыкляпэдыі

## Вялікага Княства Літоўскага, вёсак, войска

Да канца 2004 г. у выдавецтве «Беларуская энцыкляпэдыя» павінен выйсьці з друку першы том (ад А да К) «Энцыкляпэдыі ВКЛ». Артыкулы тэматычна будуць супадаць з тымі, што ў «Энцыкляпэдыі гісторыі Беларусі» і «Беларускай энцыкляпэдыі», але розьніцца большай інфармацыйнасьцю. Над ілюстраваньнем працуе мастак Зьміцер Герасімовіч, аўтар «Краіны Беларусі».

У дадатак да завершанай «ЭГБ» выйдзе «Гістарычны атляс Беларусі» ў такім самым афармленьні. Апрача мапаў, у ім будуць артыкулы-тлумачэньні ды ілюстрацыі, прысьвечаныя пэрыядам, адлюстраваным на мапах.

Сёлета мусіць скончыцца выданьне раённых кніг «Памяць». Аднак дасьледаваньне мікрагісторыі працягнецца ў 15-тамовай «Энцыкляпэдыі вёсак Беларусі». Сёлета выйдуць два тамы, прысьвечаныя Гомельшчыне. Над выданьнем працуе Інстытут мастацтвазнаўства, этнаграфіі й фальклёру НАН.

Рыхтуецца да друку й аднатамовік «Вайсковай энцыкляпэдыі». У энцыкляпэдыі будуць адлюстраваныя ўсе войны, якія прайшлі праз Беларусь, палкаводцы (ад старажытнасьці да нашых дзён), роды войскаў і інш. У кнігу ўвойдуць блізу 50 тыс. тэрмінаў, аб'ёмам яна будзе падобная да тому «ЭГБ». Ваенную тэму працягне даведнік «Палкаводцы Беларусі», прымеркаваны да 60-годзьдзя Перамогі. Што праўда, Мінабароны й Вайсковая акадэмія, якія бяруць удзел у падрыхтоўцы гэтых выданьняў, настойваюць на расейскамоўі. «Беларуская энцыкляпэдыя» прапануе кампрамісны варыянт: дубляванае выданьне па-беларуску і па-расейску.

Будуць і надалей выдавацца кнігі, прысьвечаныя старым беларускім гарадам. «Першай ластаўкай» была кніга «Друцак старажытны», наступная будзе пра Менск (аўтары Георгі Штыхаў, Юры Бохан, Захар Шыбека й інш.).

З ініцыятывы Віталя Скалабана ў выдавецтве абмяркоўваецца «Краязнаўчая энцыкляпэдыя» — выданьне, якое дасьць зьвесткі пра краязнаўцаў, краязнаўчыя выданьні, гісторыю краязнаўства і г.д. Для яе пакуль толькі складаецца слоўнік.

**Адам Воршыч**

### Выстава ў Глыбокім

**У Глыбоцкім музэі адчынілася выстава мясцовых калекцыянэраў: 13 калекцыяў, ад самавараў да лялечных машынак.** Сярод збораў — нумізматыка Рыгора Шарыпкіна, парцалянавыя статуэткі Віктара Васілеўскага, паштоўкі зь віламі Глыбокага, сабраныя аўтарам «НН» Уладзімерам Скрабатуном.

# І ў Стакгольме сьніўся Гомель



**У Музэі сучаснага мастацтва Швэцыі адчынілася вялікая выстава фатаграфій Ганны Рыўкін.**

Імя гэтай найлепшай швэдзкай фотамастачкі XX ст. нічога не гаворыць беларускім адмыслоўцам. Між тым, Ганна Рыўкін нарадзілася ў беларускім мястэчку Сураж, у габрэйскай сям'і, і ўсё жыцьцё падкрэсьлівала свае беларускія карані.

Маці Ганны, Фрыда, паходзіла з Кобрыню. Бацька, Аляксандар Рыўкін, нарадзіўся ў Гомелі. Скончыў прэстыжны Гайдэльбэрскі ўнівэрсытэт (Нямеччына), там жа абараніў доктарскую дысэртацыю па філязофіі. Вярнуўся на Радзіму, стаўся адным з найзаможнейшых прадпрымальнікаў Гомелю, дырэктарам папяровай фабрыкі. Гомельскі пагром 1903 г. зьмяніў лёс сям'і. Рыўкіны эмігруюць у Швэцыю, дзе просяць палітычнага прытулку. Стакгольм зрабіўся другой айчынай Ганны.

Усходнеэўрапейскае паходжаньне прывяло маладую фотамастачку да зацікаўленасьці этнічнымі меншасьцямі Швэцыі. Вядомасьць Ганьне прынесьлі цыклы фатаграфій з жыцьця саамі і цыганоў. Пасьля вайны Ганна здымае Швэдзкую Опэру, каралеўскую сям'ю, шмат падарожнічае па сьвеце. Фатаграфіі Ганны ўпрыгожваюць швэдзкія выданьні кніжак Астрыд Ліндгрэн, зь якой мастачка сябравала. Спачыла Ганна Рыўкін у 1970 г.

Спэцыяльна выдадзены да выставы альбом творчасьці Ганны пачынаецца з часткі «Беларускае дзяцінства». На рэклямным шчыце Музэю сучаснага мастацтва кароткія зьвесткі: «Ганна Рыўкін, найвыдатнейшая швэдзкая фотамастачка, паходзіць зь Беларусі». Яшчэ адно імя вяртаецца ў нашу расьцярушаную гісторыю. Чытачам застаецца марыць, каб цудоўная выстава некалі трапіла ў Беларусь.

**Андрэй Катлярчук, уласны карэспандэнт «НН» у Швэцыі**



**На здымку Ганны Рыўкін Астрыд Ліндгрэн.**

# Захаваць для нашчадкаў

З тае пары, як пакінуў гэты грэшны сьвет наш незабыўны Францішак Багушэвіч, мінула больш за сто гадоў. Але, як гэта ні дзіўна, да гэтай пары ацалелі жалобныя стужкі з пахавальных вянкоў. Іх да нас дайшло аж тры. На іх такія тэксты лацінкай: «Poecie i przyjacielowi włościjanie i rzemieślnicy», «Cnotliwemu i zasłużonemu», «Macieju Buraczku od Mużyczkoū-biełarusoū 15/w1900», «Zmoūkli pieśni tyje / Szto ihraū na dudce».

Лёс гэтых стужак няпросты, пакручасты, з патырчакамі. Напачатку яны перахоўваліся Багушэвічавай сям'ёй у Кушлянах. У 1940 г., пасьля далучэньня Заходняй Беларусі да Ўсходняй, з нагоды сотай гадавіны з дня народзінаў песьняра Кушляны наведаў гурт беларускіх пісьменьнікаў. Тады ж яны прывезьлі з Ашмяншчыны шэраг каштоўных памятак пра Францішка Багушэіча. Сярод іх і згаданыя жалобныя стужкі з пахавальных вянкоў. З тае пары і аж да сямідзясятых гадоў, праз усю вайну, яны, усімі забытыя, перахоўваліся ў Акадэміі навук за старымі шафамі. У канцы 70-х Акадэмію рэстаўравалі. З будынку выкідалі розны друз, сьмецьце. Разам зь ім выкінулі на вуліцы і скручаныя ў клубок стужкі. Можа б, яны так і згінулі, але выпала між гэтага друзу ісьці Міхасю Чарняўскаму. Нейкая звышсіла ці мо прафэсійны інстынкт змусілі Міхася працягнуць руку да гэтага скрутку. На стужцы значылася: «Мацею Бурачку ад мужычкоў-беларусаў». Міхасю не хацелася верыць, што перад ім арыгіналы пахавальных стужак. Падумалася: «Містыка якаясь! Падробка! Муляж!» Але, агледзеўшы як сьлед стужкі, мусіў прызнацца: перад ім арыгіналы, якім ледзь ня сто гадоў.

Ня так даўно мы разьвіталіся зь вялікім сынам нашага народу Васілём Быкавым. На высокім пагорку вянкоў на ягонай магіле шмат жалобных стужак з разьвітальнымі словамі кшталтам: «Вялікаму сыну Беларусі Васілю Быкаву» ці «Вялікаму Беларусу Васілю Быкаву ад Беларускай аўтакефальнай праваслаўнай царквы Жыровіцкай Божай Маці. Кліўленд. ЗША»...

От каб хто знайшоўся з прыхільнікаў пісьменьнікавага таленту і захаваў тыя стужкі для нашчадкаў. От яны былі б удзячныя нам, як мы тым, хто ашанаваў Багушэвічавы жалобныя стужкі.

**Уладзімер Содаль**

# Вогнішчы

Аб беларускіх кніжных вогнішчах я ўпершыню пачула ад Янкі Багдановіча (выдаўца часопісу «Шлях моладзі»). У 50-я сьледчы, які вёў яго справу, казаў: каб ня быў падсьледны беларускамоўным ды адукаваным, ніхто б да яго і не чапіўся, а так ёсьць «указаньне»... А яшчэ той сьледчы прымушаў дзядзьку Янку паліць беларускія кнігі і часопісы ў яго прысутнасьці. Дзядзька Янка добра ведаў, як складзеная ягоная грубка ўсярэдзіне, таму адразу саваў кніжкі ў схованку. Сьледчы, пераканаўшыся, што агонь добра гарыць, выходзіў, а дзядзька Янка даставаў уратаваныя кнігі. Пры канцы 80-х ён мне паказваў іх. І цяжка выказаць словамі тыя пачуцьці, зь якімі я трымала ў руках уратаваныя кнігі.

Доктар Аляксандар Курцейка зь Нямеччыны, таксама ахвяра сталінскага тэрору, неяк зацікавіўся лёсам хаты Старога Ўласа. Знайсьці пашанцавала толькі падмурак і сваякоў. На пытаньне, ці засталося што-небудзь з рэчаў, пачуў адказ, што яны ўсё спалілі. Скардзіліся, што вельмі ж доўга гарэла вогнішча, бо кніг было шмат. Спрасаваныя старонкі не хацелі гарэць.

Дзеці Язэпа Найдзюка распавядалі, што пасьля першага і адзінага вобыску ў хаце ўсю ноч палілі бібліятэку і бацькавыя паперы. Сын Францішка Аляхновіча ўзгадаў, што ў 1939 г., як толькі саветы ўступілі ў Вільню, маці спаліла ўсё, што было зьвязана з бацькам. Нават маляваны партрэт. І малы мусіў ёй у гэтым дапамагаць.

Можа, у гэтым і ёсьць адна з нашых народных слабасьцяў: не перахаваць дзе-небудзь (а такія выпадкі ёсьць: у Вільні, у наш час, у зямлі сваякі Язэпа Шнаркевіча знайшлі ягоны архіў), не падумаць пра нашчадкаў. Думаць толькі пра канкрэтны час і канкрэтную асобу — сябе.

Усе мы любім глядзець на агонь. Углядаючыся, як падскокваюць угару язычкі полымя, і стараючыся знайсьці ў гэтым нейкі сэнс... Гледзячы на агонь, я іншым часам пытаюся ў сябе: а што зрабіла б я ў той сытуацыі? І што я раблю сёньня? І што мы ўсе разам робім?

Гледзячы расейскую ТВ, чытаючы і купляючы небеларускія кнігі, супрацоўнічаючы з рэжымам, ці не падтрымліваем мы тое вогнішча, калісь запаленае?..

**Людвіка Вітушкава-Кардзіс**



# Мастацтва ў мэрыі

**За мінулыя два тыдні амаль усе віленчукі наведалі 20-павярховы хмарачос новай мэрыі, які вырас за год на праспэкце Канстытуцыі.** Перад засяленьнем гарадзкія ўлады арганізавалі ўнікальную акцыю. Кілямэтры сьценаў дзясяткаў вялікіх ды малых офісаў занялі 26 галерэй, што прэзэнтавалі гледачам творы 250 мастакоў. За адно наведаньне можна было ўбачыць суцэльную панараму сучаснага мастацтва Літвы і, што ня менш цікава для абывацеля, — пагглядзець інтэр'еры і якасьць аддзелкі амаль усіх памяшканьняў. Так, самае вялікае ўражаньне пакідае заля паседжаньняў на апошнім паверсе, адкуль адкрываецца фантастычна прыгожая панарама старога гораду.

**Дзяніс Раманюк, Вільня**

**На фота: інтэр'ер холу, аздоблены скульптурай С.Вайтэкуна.**

# Нерэстаўраваная «Багіня міру»

**Праз адсутнасьць спэцыялістаў улады Гомелю вырашылі не рэстаўраваць скульптуру «Багіня міру»** працы Васіля Дэмут-Маліноўскага з калекцыі Гомельскага краязнаўчага музэю — дакладную копію скульптуры Кановы. Некаторыя элемэнты твору страчаныя, аднак аднавіць яе няма каму. Увесну твор будзе выстаўлены ў Румянцаўскай залі «як ёсьць».

**МБ**

# Жанчыны-палітыкі

## Моцны альфабэт

**Мужчына можа ўсё, жанчына — усё астатняе. Ня толькі ў сям'і. У Беларусі хапае жанчын, уплыў якіх сягае далёка за хатнія межы. Бяз гэтага жаночага клюбу цяжка ўявіць палітычную мапу краіны.**

На літару «А» прыпадае адразу тры «вэтэранкі»: жаночага руху — **Марыя Аліева**, маладзевага выхаваньня — **Натальля Аўдзеева** і расейска-беларускай інтэграцыі — старшыня аб'яднаньня «Яблоко» **Вольга Абрамава**. Апошнія дзьве зьяўляюцца дэпутаткамі палаты прадстаўнікоў. Аўдзеева, апроч свайго ўдзелу ў камсамольскім руху на Магілёўшчы-



Вольга Абрамава

не ды прафзьвязе работнікаў культуры, вядомая тым, што распрацаваная ёй рэгіянальная праграма працы з моладзьдзю ў 2000 г. прызнаная найлепшай у краіне.

Літара «Б» зьмяшчае дзьвюх навуковых асобаў: адну зь нешматлікіх жанчынаў-палітолягаў **Ірыну Бугрову** і хіміка-рацыяналізатарку **Ганну Бураву**. Апошняя праз дырэктарства на гарадзенскім прадпрыемстве «Радыёхваля» патрапіла ў «сьпіс улады» і стала дэпутаткай ПП НС.

Літару «В» самотна ўпрыгожвае экс-старшынька Нацбанку, потым — вязень турмы КДБ і ўжо колькі гадоў — палітычная бежанка **Тамара Віньнікава**. Апошнія гады яна жыве ў Лёндане.

Літара «Г» — крыптонім трох жанчын, якія вельмі па-рознаму, але прынесьлі шмат карысьці роднай краіне. **Валянціна Голубева** добра вядомая ўдзелам у расейскай тэлевіктарыне «Што? Дзе? Калі?», а таксама спробамі



Ядвіга Грыгаровіч

стаць дэпутаткай палаты прадстаўнікоў. **Ядвіга Грыгаровіч** — прынцыповай беларускамоўнасьцю на пасадзе рэктара Беларускага ўнівэрсытэту культуры, які ўзначальвае амаль 10 гадоў. За гэты тэрмін яна здолела з «унівэрсытэту культуры ды адпачынку» зрабіць адну з самых прэстыжных ВНУ з моцным складам выкладчыкаў, стаць членам савету рэспублікі другога скліканьня. **Людміла Гразнова** прайшла вялікую эвалюцыю ад кандыдаткі эканамічных навук і дацэнткі

БДУ праз дэпутацтва ў Вярхоўным Савеце XIII скліканьня да праваахоўнай дзейнасьці. Спачатку — як актывістка «Хартыі'97», а цяпер як старшынька арганізацыі «Праваaба-



Людміла Гразнова

рончы альянс», зарэгістраванай у Літве. А за ўдзел у апазыцыйных мітынгах ёй даводзілася й пасядзець суткі ў спэцпрыёмніку на Акрэсьціна.

**Ала Данілава**, да 2002 г. — першая сакратарка ЦК Беларускага саюзу моладзі — адзінае прозьвішча на літару «Д». Дый яна ўжо паўтара году ў адстаўцы, у якую пайшла, не пагадзіўшыся з аб'яднаньнем яе арганізацыі з пралукашэнкаўскім БПСМ. Гадуе дзіця.

**Надзея Ермакова** — адзіная пэрсона на «Е». Але якая! З 96-га — старшынька праўленьня ААБ «Беларусбанк», з 97-га — сябра праўленьня Нацбанку, з 99-га — старшынька Беларускага саюзу жанчын, а з 2000 г. — член савету рэспублікі, дзе займае пасаду намесьніцы старшыні камісіі па эканоміцы, бюджэце й фінансах. Вось гэта кар'ера ўраджэнкі маленькай вёскі з Хоцімскага раёну!

Пра **Галіну Жураўкову** апошнім часам даведаліся нават тыя, хто за папярэднія два з паловай гады, якія яна ўзначальвала Кіраўніцтва справаў прэзыдэнта, пра яе ня ведаў. Сядзіць у турме, а яшчэ месяц таму па ўплывовасьці была трэцім чалавекам у Беларусі. Пасьля Лукашэнкі і Шэймана. Цікава, хто рызыкне павіншаваць Галіну Анісімаўну з 8 сакавіка? Сын жа яе таксама за кратамі.

Літарай «І» аднаасобна кіруе ў нядаўнім мінулым старшынька Саюзу пісьменьнікаў, а



Вольга Іпатава

цяпер — проста літаратарка, а ў дадатак сяброўка Рады БСДГ **Вольга Іпатава**.

На літару «К» прадстаўніца апазыцыі яўна мацнейшая за **Валянціну Качан** — дэпутатку палаты прадстаўнікоў, якая дагэтуль пяць гадоў была галоўным санітарным доктарам Берасьцейскай вобласьці. Бо **Ірыну Красоўскую**, моцную жанчыну, здольную трымаць удар лёсу, пасьля выступу на канфэрэнцыі ў Рызе сталі лічыць кандыдаткай у прэзыдэнты 2006 г. Лёс **Сьвятланы Калінкінай**, якая больш за дзесяць гадоў прыбірае сьмецьце за беларускай уладай, зьвязаны зь «Белорусской деловой газетой», дзе яна зьяўляецца галоўнай рэдактаркай.



Сьвятлана Калінкіна, Жанна Літвіна

**Жанна Літвіна**, старшыня Беларускай асацыяцыі журналістаў, апошнія дзесяць гадоў жыве на лініі фронту. Баявых стратаў пакуль больш, чым перамог, але свой галоўны прынцып — «Трымайся праўды!» — яна здаваць не зьбіраецца.

«М» — ізноў трыюмвірыят. Рафінаваная інтэлігентка, лінгвістка **Алена Макоўская** — старшыня рады Згуртаваньня беларусаў сьвету «Бацькаўшчына». Заўзятая «дачніца», «прафсаюзьніца» і па сумяшчальніцтве — кіраўніца Жаночай партыі «Надзея» **Валянціна Матусевіч**. А таксама дачка свайго бацькі **Натальля Машэрава**, якая пабаялася працягнуць яго справу на самай вышэйшай пасадзе ў 2001 г. Шанцы былі, і някепскія. Больш, здаецца, ня будзе.


Валянціна Матусевіч

Літарай «Н» поўнасьцю валодае палітоляг і кандыдат філязофскіх навук **Сьвятлана Навумава**.

Затое «П» зьмяшчае дзьвюх дэпутатак «палаткі» — **Марыю Праташчык** ды **Зінаіду Пянькову** — і дзьвюх сяброўак БХК — **Тацяну Працьку** ды **Людмілу Пеціну**, а апроч іх — міністарку аховы здароўя ды галоўную цешчу краіны **Людмілу Пастаялку** ды кіраўніцу перадвыбарчага штабу Ўладзімера Ганчарыка на прэзыдэнцкіх выбарах-2001 **Ва-**



Тацяна Працька



Людміла Пастаялка

**лянціну Палевікову**. Апошняя, згубіўшы кіраўніцтва ў партыі «Надзея», ужо два гады намагаецца самастойна паўдзельнічаць у партыйным будаўніцтве. Пакуль няўдала.

«С» — літара цалкам «партыйная». Сяброўкі адпаведна Партыі БНФ (**Галіна Сям-**



Валянціна Палевікова

**дзянава**), ПКБ (**Алена Скрыган**) ды БСДП (НГ) (**Ніна Стужынская**) адыгрываюць кожная ў сваёй партыі не апошнія ролі. Сямдзянава, праўда, цяпер часова адышла ад актыўных палітычных справаў. Але яна вернецца. Такі



Галіна Сямдзянава (справа), Алена Скрыган (зьлева)

чалавек. Свайго кшталту беларускай партыяй, раскіданай па ўсім сьвеце, зьяўляецца і Рада БНР, якую ўзначальвае спадарыня **Івонка Сурвілла**.

«Т» знаходзіцца ў поўным падпарадкаваньні старшынькі Міжнароднага грамадзкага аб'яднаньня «Беларуская пэрспэктыва» **Валянціны Трыгубовіч**.


Валянціны Трыгубовіч

А «Х» — літара дзьвюх процілеглых асобаў: адважнай публіцысткі **Ірыны Халіп** і **Марыі Худой**, выпускніцы Вышэйшае партыйнае школы, потым — старшынькі калгасу, партыйнай работніцы, і цяпер — дэпутаткі ПП НС.

**Тамара Чобатава** — старшыня прафзьвязу работнікаў адукацыі — немаведама як уседзела ў сваім крэсьле ад Ганчарыка праз Вітко і пры Козіку.

**Людміла Шарамет** вядомая шырокай грамадзкасьці ў першую чаргу як маці свайго сына-журналіста Паўла. А між іншым яна сама вядзе актыўную грамадзкую дзейнасьць, зьяўляючыся сустаршынькай арганізацыі «Жаночы незалежны дэмакратычны рух».

І пры канцы — адна з самых уплывовых жанчынаў краіны, старшыня Цэнтравыбаркаму **Лідзія Ярмошына.** Яна займае гэтую пасаду ўжо больш за сем гадоў. І, здаецца, будзе займаць яшчэ два з паловай.

**Зьміцер Дрыгайла**

# Без камплімэнтаў

## Ці можа жанчына ўзначаліць Беларусь

На пачатку лютага газэта «The Washington Times» надрукавала нататку пад назвай «Дэмакратычныя мары», якую потым перадрукавалі многія беларускія выданьні. Публікацыя тычылася вядомай міжнароднай канфэрэнцыі ў Рызе з удзелам беларускае апазыцыі. Газэта асобна адзначыла выступ на канфэрэнцыі Ірыны Красоўскай і прыняла характарыстыку, зробленую адным зь сяброў дэлегацыі. Ён параўнаў жонку зьніклага бізнэсоўца з Карасон Акіна — удавой забітага філіпінскага апазыцыянэра, вакол якой згуртавалася апазыцыя ды скінула дыктатуру Фэрдынанда Маркаса. Аб тым, наколькі карэктнае такое параўнаньне і ці можна ўвогуле раўнаць Беларусь з экзатычным архіпэлягам, — крыху пазьней.

Тут хачу зазначыць, што на інтэрнэт-сайце аднае вельмі паважанае дэмакратычнае партыі, дзе быў зьмешчаны, паводле анатацыі, «поўны пераклад» згаданага артыкулу, менавіта гэты пасаж пра Карасон Акіна адсутнічаў. Вось такі прыклад джэнтэльмэнства ў палітыцы. Пакуль жанчыны выступаюць у ролі ахвяраў — як жонкі, маці, дочкі зьніклых, гэта выклікае ў сярэднестатыстычнага палітыка нармальную рэакцыю. Ён гатовы выступаць у іх абарону. Але як толькі жанчына дэманструе ня толькі самаахвярнасьць і адданасьць (няважна — дзецям, сваякам альбо нейкай справе), але ж розум, дасьціпнасьць і моцную волю, яна адразу ператвараецца ў канкурэнта. Прычым канкурэнта асабліва небясьпечнага, паколькі да традыцыйнага мужчынскага набору пазытыўных якасьцяў дадаюцца яшчэ і якасьці жаночыя, супрацьстаяць якім цяжка і ў палітыцы, асабліва палітыкам мужчынскага полу.

Развагі пра канкурэнцыю, аднак, слушныя толькі ў выпадку, калі мы гаворым пра больш-менш нармальнае сучаснае грамадзтва, у якім дзейнічаюць больш-менш аднолькавыя правілы гульні для ўсіх. Заходняе грамадзтва іншы раз таксама цяжка бывае прызнаць за нармальнае, асабліва калі гаварыць пра крайнія праявы фэмінізму. Не ўдаючыся ў ацэнку фэмінізму як зьявы, скажу толькі, што любая форма сэгрэгацыі — расавай, полавай і г.д. — у нармальнага чалавека, я думаю, мусіць выклікаць пратэст. Памятаеце Оруэла — усе жывёлы роўныя, але некаторыя больш роўныя за астатніх? Куды важней зразумець, што ўсе людзі, найперш, розныя, а ня роўныя. Гэта не адно і тое ж.

Аднак вернемся да палітыкі. На Захадзе даўно ні ў кога не выклікае зьдзіўленьня, а тым больш пратэсту ўдзел жанчынаў у палітыцы. Ня будзем згадваць Маргарэт Тэтчэр, Гілары Клінтан, Гру Гарлем Брунтлянд ці нябожчыцу Элізабэт Лінд. Нават у такога зацятага францускага традыцыяналіста, як Лё Пэн, дачка ўдзельнічае ў палітыцы ды выступае зь яшчэ больш радыкальных пазыцый, чым бацька. У суседняй Польшчы самы высокі рэйтынг сярод магчымых кандыдатаў на пасаду прэзыдэнта мае жонка цяперашняга прэзыдэнта Квасьнеўскага Яланта. Праўда, адна справа — называць імя папулярнай жанчыны ў апытаньнях, і зусім іншая — галасаваць за яе. Здаецца, што на прэзыдэнцкіх выбарах у каталіцкай Польшчы перамożам будзе мужчына. Калі ж мне нагадаюць аб прэм'ерцы Ганьне Сухоцкай, дык я адкажу, што яна была прызначаная на гэтую пасаду, а не абраная.

А цяпер зьвернемся да беларускае сытуацыі. Калі я казаў пра «джэнтэльмэнскі набор» пазытыўных якасьцяў палітыка, дык не назваў такія найважнейшыя зь іх на сёньняшні дзень, як уменьне рэгулярна ўжываць сьпіртусовыя напоі ў нечалавечых дозах і галоўнае — беспардоннае хамства, што зьяўляецца свайго роду генэтычнай спадчынай нядаўняга савецкага мінулага. Зразумела, і ў гэтым пытаньні сярод жанчынаў бываюць выключэньні. Напрыклад, у аднае цяперашняй расейскай губэрнатаркі ў бытнасьць яе камсамольскім лідэрам была, кажуць, мянушка — Валька-шклянка. Ня думаю, што і ў сёньняшняй Расеі гэткая мянушка ўспрымалася б як абраза. Дый у Беларусі... Ужо ў нашыя дні адзін беларускі журналіст прысьвяціў сваёй калажанцы радыёкамэнтар, у якім пералічыў усе найлепшыя яе духоўныя й працоўныя якасьці. А на завяршэньне прыхаваў галоўны, на яго думку, камплімэнт: «Можа адна выпіць бутэльку гарэлкі».

Кар'ера «дзелавой жанчыны» ў Беларусі, аднак, патрабуе ўсё-такі дысцыпліны. Калі п'янства чыноўніка мужчынскага полу начальства схільнае лічыць дробным недахопам, дык жанчыне такое можа й не сысьці з рук. Праўда, кар'еры Віньнікавай ці Жураўковай пасканчаліся зусім зь іншых прычынаў. Так што, па вялікім рахунку, дыскрымінацыі паводле полавых прыкметаў у найвышэйшых беларускіх сфэрах няма.

Іншая справа, што апынуцца на самым версе службовай гіерархіі — г.зн. стаць кіраўнічкай дзяржавы пры захаваньні цяперашняй савецка-бізантыйскае мадэлі ўлады — жанчына папросту ня можа. Бо ў патэрналісцкай (ад лацінскага слова «патэр» — бацька) у адносінах да грамадзянаў дзяржаве такое немагчыма паводле азначэньня. За жанчынамі назаўсёды замацаваныя ў такой сыстэме дзьве-тры пасады як максымум магчымага: міністар аховы здароўя ці сацыяльнага забесьпячэньня. Ну, можа, яшчэ культуры.

А вось стаць лідэркай апазыцыі? Тут магчымыя варыянты. Цікава, што менавіта ў недэмакратычных краінах Усходу жанчыны, нягледзячы на засільле патрыярхату, нярэдка ўзначальвалі шэрагі апазыцыі — ад Бэназір Бхута ў Пакістане да Аунг Сан Су Чжы ў М'янме. Праўда, абодва гэтыя прыклады сумныя, калі ўспомніць, што абедзьве дзяячкі перабываюць пад арыштам. Застаецца зьвярнуцца да прыкладу згаданай ужо Карасон Акіна.

Фэрдынанд Маркас правіў на Філіпінах 30 гадоў запар, зь іх апошнія 15 — гэта была жорсткая дыктатура. Асуджанага спачатку на сьмяротнае пакараньне лідэра апазыцыі Бэніга Акіна выслалі з краіны, а калі ён вярнуўся на пачатку 80-х, вайскоўцы яго забілі. Грамадзкасьць рэзка адвярнулася ад Маркаса, рэжым якога заграз у карупцыі. У 86-м Маркас праводзіць выбары і, насуперак правальным для яго вынікам, абвяшчае сваю перамогу. Пасьля гэтага ўсе апазыцыйныя партыі (за выключэньнем камуністычнай) аб'ядноўваюцца вакол асобы Карасон Акіна. На яе баку — сымпатыі народу, царквы й падтрымка міжнароднае супольнасьці. Урэшце яна становіцца прэзыдэнтам. Праўда, вялікіх эканамічных посьпехаў Філіпіны і пры Акіна не дасягнулі. Большасьць насельніцтва — у асноўным каталіцкага, але зь вялікай праслойкай мусульманаў — працягвала жыць у беднасьці. Таму ёй даводзілася правіць з дапамогай вайскоўцаў аўтарытарнымі мэтадамі.



PHOTO.BYMEDIA.NET

Гэтую гістарычную даведку я прывёў не для таго, каб яшчэ раз кагосьці з кімсьці параўноўваць. Усе параўнаньні кульгаюць — прынамсі, на адну нагу. Хацеў бы сказаць, што ў палітыцы не патрэбныя ілюзіі. Вера ў чароўную каралеўну нічым ня лепшая, чым вера ў чароўнага прынца ці добрага цара. Расчараваўшыся ў палітыкахмужчынах, ня трэба адразу ўскладаць усе спадзяваньні на жанчынаў і верыць у цуд. Гэта не па-мужчынску.

З другога боку, у нямецкіх журналістаў ёсьць такі панятак, які можна прыблізна перакласьці як «той, хто высунуўся ў акно». Іншымі словамі, калі йдзе дождж і дзьме вецер, можна сядзець дома й носу на двор не высоўваць. Але калі ты ўжо высунуўся — дык не зьдзіўляйся, што табе льецца нешта на галаву і за каўнер. Немцы лічаць, што палітык — гэта той, хто высунуўся на двор. Яму ня варта наракаць на тое, што пра яго не заўсёды добра пішуць, немаведама што гавораць, што яго словы і ўчынкі няправільна ацэньваюць. Добра яшчэ, калі ацэньваюць журналісты, а не суды й праваахоўныя органы. Палітыка патрабуе мужнасьці, у тым ліку і ад жанчынаў. Але ў жанчынаў ёсьць шмат іншых якасьцяў. За якія, уласна кажучы, мы іх і любім.

**Віталь Тарас**

Расчараваўшыся ў палітыкахмужчынах, ня трэба адразу ўскладаць усе спадзяваньні на жанчынаў і верыць у цуд. Гэта не памужчынску.

# Вілка, штэкер і гняздо

**Павесяліла мяне добра прапанова назваць разэтку й вілку лычкай ды тычкай.** Цікава. Але мушу заўважыць, што слова «тычка» ўжо існуе зь іншым сэнсам. Гэта нейкі калок, які тыкаюць на градку, каб віліся павойныя расьліны. Або шост, якім садавіну зьбіваюць. Або паплавок, буёк. А яшчэ казалі пра таго, хто задаецца: «Задраў носа — тычкай не дастанеш». Цяпер слова «тычка» ўжываюць таксама адносна тых вехаў у чырвона-белыя палоскі, якія ўзімку на ўзбочынах дарог стаяць, каб край дарогі пазначыць. А яшчэ я жартам называю тычкай тэлевізійную вышку. Гэтая мэталёвая канструкцыя тырчыць, бы сапраўдная тычка. Я так і кажу — тэлетычка!

А што да разэтак ды вілак, дык, можа, ня трэба так адпрэчваць тое, што маем. Слова «вілка» для нас не чужое. Усе ў вёсцы ведаюць, што такое вілкі, якімі гной кідаюць. Падабенства ж нейкае ёсьць. Таму вілку можна пакінуць вілкай. Дарэчы, яшчэ вілку называлі штэкерам. Але слова гэта нямецкае, а мы хочам нечага свайго, так?

Разэтку, на прыклад польскай ды ангельскай моваў, можна назваць проста — «гняздо». Прынамсі, і гэтае абазначэньне разэткі для палешукоў ня новае. Уласна птушынае гняздо ў нас называюць кублом.

Такім чынам, можна ўтыкаць вілку (ці штэкер?) у гняздо. Як вам?

Хачу дадаць яшчэ пару слоў зь іншай галіны. Я мушу сутыкацца з аўтамабільнай тэрміналёгіяй. Там таксама ўсё занядбана. Дык я ўжываю для сябе некалькі новых словаў, каб замяніць расейскія калькі. Аўтамабільны рэмень — «пас». Дворнікі, што шыбу выціраюць, я называю «выцірачкі», паводле іх прызначэньня. А вось з падшыпнікам давялося цяжкавата. Вельмі не падабалася мне гэтае слова. Чуюцца ў ім шыпы. А да самога падшыпніка ніяк яны не стасуюцца. Палез я тады ў слоўнікі і заўважыў, што ў некаторых мовах у аснове гэтага тэрміну ёсьць слова «ложак», ці «ложа». Круціў я гэтае ложа на языку — нічога ня выйшла. Але аднойчы неяк сама стварылася камбінацыя з падшыпніка і ложа — «падложа». Так я ўжо і прызвычаіўся да гэтага слова. Здаецца, што яно даўно ўжо існуе. Неяк я прапанаваў яго ў газэце «Наша слова». Дык чытачы адгукнуліся станоўча.

Напрыканцы хачу пажадаць, каб «НН» працягвала справу рэабілітацыі нашай мовы. Гэта і цікава, і неабходна.

**Яўген Саляйчук, Пінск**

# Вострая шруба, вушкі, зьмейка...

**Падчас пошуку словаў для абазначэньня новых прадметаў побыту часьцяком узьнікаюць дзьве крайнасьці:** або бязбожна калькуюцца расейскія назвы, або выдумляюцца лексэмы, якія кепска прыжываюцца ў мове. Вось і паўстаюць з аднаго боку «вілка» й «разэтка», а зь іншага — «тычка» і «лычка». Маўленчая практыка вымагае кампраміснага варыянту. Асноўнае значэньне расейскага слова «вілка» — сталовы прыбор. На падставе падабенства гэтак сталі менаваць прыстасаваньне з раздвоеным канцом. Паводле лёгікі, найбліжэйшы беларускі адпаведнік — «відэлец». Але ў нашай мове ёсьць больш зграбнае слова: «вілкі», пры дапамозе якіх вымаюць зь печы чыгункі. Чаму не карыстацца гэтым словам для абазначэньня электрычнай прылады?

Што да «разэткі», то ня будзе вялікай трагедыі, калі мы ня знойдзем дарэчнага адпаведніка. Бо ня кожнае запазычанае слова можна перарабіць на свой капыл. Сёньня наўрад ці каму замanецца перабеларусіць такія запазычаньні, як «ланцуг», «фарба», «дах», бо мы зь імі даўно зжыліся. Ёсьць вэрсія, што нават «сьвятая сьвятых» «бусел» — слова татарскае. Ня варта барацьбу за чысьціню мовы даводзіць да абсурду.

Іншая рэч, калі мы, маючы ўласныя словы, зь нейкіх прычынаў іх ігнаруем. Сп.Заякоць паставіў слушнае пытаньне што да адрозьненьня між «шурупом», «вінтом» і «болтом». Акадэмічныя слоўнікі «винт» і «шуруп» перакладаюць адным словам — «шруба». Каб адрозьніваць, прапаную ўвесьці дадатковы прыметнік. Пагатоў, такія спалучэньні існуюць у мове («вярба» і «ніцая вярба»). Такім чынам, «винт» — «шруба», а «шуруп» хай завецца «вострай шрубай». Таксама варта вярнуць да жыцьця слова «ніт» («болт»), якое акадэмічныя слоўнікі сьпісалі былі ў «архіў». Зь яго вынікаюць цалкам натуральныя вытворныя: «зьнітаваць», «зьнітаваньне», «узяць на ніты». «Баранчыкі» можна перайменаваць на «вушкі», формаю дужа падобныя.

Няцяжка знайсьці свае адпаведнікі і для сантэхнікі. «Зьмеепадобную сушылку для ручнікоў» можна назваць паводле галоўнай прыметы: «зьмейка». Немілагучны «зьмешвальнік» досыць лёгка пераўтвараецца на «зьмяшальнік». Найболей сынонімаў мае, бадай, самае папулярнае сантэхнічнае прыстасаваньне — ад грувастка-паэтычнага «фаянсавага помніка ахвярам рэжыму чалавечага страўніка» (Віктар Жыбуль) да больш простых: «кляээт», «таўчок», «гаршчок», «белы». Варыянтаў безьліч.

Відавочны русізм «кораб» (або «каробка») па-наску гучыць як «пушка».

Слова «дамок», прапанаванае спадаром Касьцюкевічам для абазначэньня «хаткі» для лямпачкі, не пазбаўленае цікавасьці. Але ж ці трэба цурацца слова «патрон»? У мове яно існуе. Апроч таго, «хатка» для лямпачкі сапраўды выдае на патрон. Аднак з патрыятычных меркаваньняў няцяжка прыдумаць паводле формы рэчы адмысловае беларускае мяно. Да прыкладу, «ступка». Ці «кубак». Або «чарка», «кілішак» (дзеля больш шага калярыту). Каб лямпачка не сумавала, не абмінём і яе. Хай «цокаль» будзе «напарсткам», а «колба» — «шкляньняком». Цалкам дарэчным я ўважаю слова «калодка». Ёсьць жа ў нашай мове «калода». Хай будзе й «калодка» (тая ж калода, толькі маленькая).

**Валянцін Бойка, Мазыр**

# Утор ва ўторыне

**У «НН» за 16 студзеня сп.Вацлаў Заякоць закрануў пытаньне аб беларускіх эквівалентах расейскіх словаў, што пазначаюць электрапобытавае начыньне.** Безумоўна, пытаньне вартае ўвагі, але ўсё ня так блага, як падаецца. Колькі часу таму з старонак «НН» пан Скіргайла Палянэцкі прапанаваў найцудоўнейшыя, на мой погляд, адпаведнікі словам «вілка» і «разэтка»: «утор» і «ўторына» адпаведна. З таго часу мае сябры пачалі актыўна ўжываць гэтыя варыянты. І нават мае расейскамоўныя прыяцелі цяперака цьвёрда ведаюць, што такое ўтор ва ўторыне! Прайшоўшы такое выпрабаваньне часам, гэтыя нэалягізмы могуць па праве заняць сваё месца ў нашым штодзённым моўным ужытку.

**Андрусь Сяркоў, Менск**

# Маркет–мэйкер ці рынкароб

**Назіральная рада Валютна-фондавай біржы зацьвердзіла палажэньне пра маркет-мэйкераў па каштоўных паперах і кароткатэрміновых аблігацыях.** Маркет-мэйкер — сябар Сэкцыі фондавага рынку біржы, які атрымаў права на ўдзел у таргах. Такім чынам, нарматыўным стала яшчэ адно запазычаньне.

Маркет-мэйкер — з тых словаў, якія Кералава Алеся называла «складанымі і таму вельмі прыгожымі». Але ці патрэбнае ў беларускай мове? «Рынкароб» ні горш гучала б. Іншы скажа: дык гэта інтэрнацыянальнае. А я думаю: наскае было б і ясьнейшым, і прыгажэйшым. На гэткія словы і рэагаваць бы акадэмічнаму Інстытуту мовазнаўства, і рэкамэндаваць свае варыянты.

**Слава Камолка, Менск**

Нагадваем, што чарговы тур «моватворчасьці» Вацлаў Заякоць запрапанаваў прысьвяціць назвам «аддзелачных матэрыялаў». Як найлепш было б па-беларуску называць «пробку» (электрычны засьцерагальнік), «патрон» (куды ўкручваецца лямпачка), «калодку» (клемную калодку для злучэньня электраправадоў), «кораб» (яго яшчэ называюць «кабэль-канал»), «разэтку», «вілку», «цокаль», «капсуль», «зьмешвальнік» (кран для рэгуляванай падачы халоднай і гарачай вады), зьмеепадобную сушылку для ручнікоў (звычайна яны знаходзяцца ў ванных пакоях), замочную шчыліну? Як на ўзроўні аднаго слова правесьці ўпэўненае адрозьненьне паміж шурбай («шурупом»), «вінтом» (бываюць яшчэ «вінты» з «баранчыкамі», якія закручваюцца пальцамі) і балтом з гайкай (устарэлае слова «ніт»)? Як лексычна адрозьніць засаўку-кран ад засаўкі на дзьверах? Замочны фіксатар?

Андрэй Расінскі

# Загубленыя экстазы

эсэ

У вобразах, якія нам зь няўклюднай ветлівасьцю прапануюць афіцыйныя мэдыі, зьзяе адна прыкрая адсутнасьць. Яна тым болей дзіўная, што вышэйшая дзяржаўная асоба ўвесь час згадвае пра непрысутны аб'ект, штодзённа пра яго клапоціцца і, здавалася б, зацікаўленая ў паўнавартасным яго прадстаўленьні.

«Жэншчына» — нязьменны адрасат віншаваньняў, падзякаў, узор для перайманьня тым мужчынам, якія шчэ сумняюцца, за каго галасаваць. «Жанчына — прыгажуня… Жанчына — мой выбарнік…» — так звычайна гаворыцца. Але ці прысутны на беларускім экране жаночы экстаз?

Калі ў «Калыханцы» Дзігі Вертава (пра Іосіфа Сталіна) жанчыны заліваюцца сьлязьмі й сьмяюцца, тысячамі рук цягнуцца да свайго правадыра, дояць ягоныя пальцы й заходзяцца ад ягоных абдымкаў — гэта экстаз.

Калі ў нямецкай хроніцы дзяўчаты крычаць ад радасьці і праз гады сэрцы іх заходзяцца ад аднае згадкі пра дотык да свайго фюрэра — гэта экстаз.

Дзе ў Беларусі дзявочыя рукі, якія цягнуцца да самага сьвятога? Дзе крыкі, кветкі і непрытомнасьць? Дзе заплаканыя ад шчасьця раты? Дзе гістэрыка і віск ад аднаго толькі дарагога й да немагчымасьці паўсюднага голасу?

Чаму ўздоўж лыжна-ролерных трасаў не стаяць натоўпамі дзявулі з плякатамі «Хачу дзіця ад Усенароднаабранага!!!» — і іх не разганяе шаблямі конная міліцыя?

Гэта яўны пракол і для мяне невытлумачальная загадка.

У 30-я ў Нямеччыне былі выдадзеныя «Лісты каханьня Адольфу Гітлеру». «Я зраблю табе ключы ад уваходных дзьвярэй і маёй спальні, — піша адна жанчына аб'екту сваіх жаданьняў. — Мы павінны быць асьцярожныя. Так што прыходзь раней, пазвані гаспадыні і даведайся, ці дома я. Так што мы можам праводзіць ночы разам!»

«Мой цукровы, саладзенькі, — зьвяртаецца іншая, — я магу цалаваць цябе тысячы і тысячы разоў і заставацца неспатольнай! Маё каханьне да цябе бязьмежнае, такое гарачае, яно перапаўняе мяне!..»

Не хачу казаць анічога благога пра нашу ўладу, і асабліва пра самую каштоўную яе частку, але ўявіць нешта падобнае ў Беларусі цяжкавата.

У каханьні, дакладней, у прыхільнасьці да найвышэйшага абраньніка, публічна прызнаюцца — а пасьля гэтага ідуць скаргі на дах, які цячэ, на суседа-нягодніка, на заробкі мізэрныя — карацей, аніякай тэбе бескарысьлівасьці і наіўнай шчырасьці.

А з «карцінкамі» сытуацыя ўвогуле правальная. У найлепшым выпадку згадаецца недарэчная піянерка з кветкамі ці счырванелая ад хваляваньня пэнсіянэрка, што ніяк ня можа надзякавацца прэзыдэнту, — дый тая з фільму дысыдэнта Хашчавацкага.

У навінах, аналітычных выпусках дзявочыя твары — як і мужчынскія — стрымана ветлівыя, найбольшае — агорнутыя цiхай радасьцю ад знаходжаньня побач з народнай існасьцю. Але гэта ніяк нельга назваць экстазам.

Становішча крыху ратавалі дзяржаўныя журналісткі. Калі яны афіцыйна-дрыготкімі, палахліва-шчасьлівымі галасамі паведамлялі пра ўзначалены кіраўніком прарыў на якім-небудзь урупінскім напрамку, у гэтым было нешта ад глыбокага экстазу. Але яны людзі паднявольныя, на службе, ім не асабліва паверыш. Толькі аднойчы камэра схапіла на твары тэледзяўчы (яна зрабіла імклівую кар'еру ў бітвах за ўраджай) незапраграмаваную, шчырую й найвышэйшую асалоду, якой мо і ня можа быць, — але гэта было неяк упохапкі, на хвілю, імгненна й сарамліва.

Экстаз на беларускіх экранах збольшага праяўляюць замежныя жанчыны — малавядомая сэрбская акторка, фільм якой навязліва дэманстраваўся, аўтарка перадачы «Масква—Менск», для якой нават была ўрачыста сыграная на баяне песьня Абадзінскага «Льет ли теплый дождь…». Сьведкі, якія бачылі па тэлевізіі гэтую сцэнку, — у экстазе. Злыя языкі сьцьвярджаюць, што баянныя сьпевы — гэта найлепшае, што ўдаецца Аляксандру Рыгоравічу.

Ды няўжо на ўсю краіну ні знойдзецца хоць бы роты пэнсіянэрак, каб іх падгрымліраваць і выпусьціць на «аб'ект пакланеньня»? Але гэтага ні ў якім разе не патрабуецца.

І ня толькі таму, што пасьля пацалункаў пачнуцца практычныя пытаньні пра пэнсіі, тарыфы й г.д. Для беларускай дыктатуры жаночы экстаз небясьпечны.

Мала таго што ён перашкаджае гуляць у хакей, катацца на лыжах і займацца іншымі дзяржаўнымі справамі — ён яшчэ можа быць намёкам на самастойнасьць, на жаночую аўтаномію. У Беларусі ж, якая аніяк ня можа разьвітацца зь сенам на асфальце, жанчыны зьнівэляваныя да мужчынаў, а мужчыны да скапцоў: вось яны сядзяць ва ўзмакрэлых касьцюмах, хаваюць вочы, слухаюць, насупленя пішуць...

Эфэктная й самастойная жанчына на беларускіх экранах — гэта ж канкурэнтка галоўнаму герою. А герой мусіць быць толькі адзін. Немагчыма знайсьці ў беларускіх умовах кагосьці кшталту Эвіты Пэрон. *У нас герой і гераіня ў адной асобе.* Мо таму яскравую й шыкоўную банкірку Віньнікаву арыштоўвалі і прыніжалі публічна, з крыкамі, — каб паставіць крыж на пасьпяховай акторскай кар'еры ў палітычным вар'етэ. А гаспадарніцу Жураўкову зьнялі ціха — і ня толькі таму, што для яе знойдуцца й другарадныя амплюа. Не суперніца яна шматгадовай зорнай прыме.


АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

Немагчыма знайсьці ў беларускіх умовах кагосьці кшталту Эвіты Пэрон. У нас герой і гераіня ў адной асобе.

Як ні дзіўна, але Аляксандра Рыгоравіча беларускія мэдыі падаюць як узор ня толькі для мужчынаў, але найперш — для жанчынаў. Найлепшая лыжніца. Найлепшая сяброўка. Найлепшая дарадчыца. Але праява самастойнасьці, экстазу і аўтаноміі можа выклікаць бурлівую акторскую рэўнасьць.

Так і застаецца экстаз непрадстаўленым, няспраўджаным і загубленым. А беларускім жанчынам — найлепшым выбарніцам — прыходзіцца дома суцяшацца звычайным: «Няхай пітушны, але свой… Дурны, нягеглы, «чарка ды шкварка» — абы мужчынка, хоць бы такі…» А ў некаторых нават і такога няма!

Ізноў знойдуцца нагоды для віншаваньняў. Будзе ўздымацца келіх за «жэншчын». Толькі ў гэта, здаецца, ня верыць і сама крыніца экстазу.

# Вяртаньне да сябе

## Людміла Шамчук у «Аідзе»



«СОВЕТСКАЯ БЕЛОРУССИЯ»

Размова зь Людмілай Шамчук выявілася значна цікавейшай за «Аіду» зь яе ўдзелам. Ратавала Ніна Шарубіна ў партыі Аіды, з уласьцівым ёй уменьнем ператвараць мёртвы тэкст ролі ў жывую плоць чалавечых пачуцьцяў. Гэта ня значыць, што 21 лютага гастралёрка сьпявала дрэнна. Наадварот! У сцэне судзілішча Шамчук выдала дэцыбэлы, годныя сусьветнай славы. Праўда, дзеля гэтага вымушаная была берагчы сілы, так што першыя два акты яе амаль не было чуваць.

30 гадоў таму мэцца-сапрана спадарыні Шамчук вытрымлівала параўнаньне з валютнымі галасамі славутых маскоўскіх пяюльляў — Алены Абразцовай, Тамары Сіняўскай. Цяперака іх галасы гучаць хіба на кружэлках. А голасу Шамчук час амаль не пашкодзіў. Як не пацярпела й яе паўдзённая сонечная прыгажосьць, прамяністая цеплыня вачэй і бель скуры.

Аднак для «Аіды» гэтага недастаткова. Трэба яшчэ багата сэрца — жывых, нявыдуманых пачуцьцяў, гатоўнасьці жыць жыцьцём гераіні ды цярпець яе пакуту. Тады казачная гісторыя фараонавай дачкі Амнэрыс, рабыні Аіды і палкаводца Радамэса набірае рэальнасьць. Спадарыня Шамчук у ролі Амнэрыс не пакутавала, а проста сьпявала. Дый данецкі дырыжор Васіль Васіленка больш клапаціўся пра камфорт публікі і салістаў, чым пра сапраўдны драматызм. Выйшла як у паскораным кіно — весела, мітусьліва і легкадумна.

Затое падчас размовы з журналістамі спн.Шамчук не хавала сьлёз. Свой выступ у «Аідзе» яна прысьвяціла памяці галоўнага дырыжора Яраслава Вашчака і рэжысэра Сямёна Штэйна. Яны 30 гадоў таму апекавалiся данецкай дзяўчынай (бацька — украінец, маці — грачанка, цэлае жыцьцё працавала мэдсястрой), што пасьля Адэскае кансэрваторыі трапіла ў Менск. Шамчук успамінала, як пасялілася ў інтэрнаце насупраць тэатру, потым — у аднапакаёўцы. Як рэпэтавала ў 204-й грымёрцы першыя партыі. У памяць пра той шчасьлівы час пяюха некалькі гадоў таму здабыла для беларусаў запрашэньне на фэст у Салятурн.

Увосень 1976-га Людміла выйграла Ўсесаюзны конкурс імя Глінкі. Праз пару тыдняў міністар культуры СССР Пётар Дземічаў запрасіў яе ў Вялікі тэатар. Адмовілася, бо не хацела развітвацца з той атмасфэрай духоўнасьці, дабрыні й артыстычнага брацтва, якая панавала ў Менску. «У тэатры было шмат маладых сьпевакоў, сёньня зь іх застаўся хіба Яраслаў Пятроў, — успамінае Шамчук. — Вашчак называў нас «дзетанькі».

Аднак Дземічаў настойваў. Запрасіў на праслухоўваньне, потым на замену. Штэйн таксама падштурхоўваў у бок Масквы: прапанаваў ролю Жэнькі ў спэктаклі «А досьвіткі тут ціхія...», які ён ставіў на сцэне Вялікага. Аўтарам музыкі быў дырэктар «галоўнага тэатру краіны» Кірыл Малчанаў. Так што, у выпадку ўдачы, кар'ера Шамчук была забясьпечаная. Пяюльлі дырэктарская опэра не падабалася, яна тэлефанавала Вашчаку і плакала. А ён адказваў: «Навошта табе тая Масква і тая Жэнька? Вяртайся, засьпяваеш Амнэрыс у «Аідзе»!»

Але маскоўскія чыноўнікі дзейнічалі хітра. Дапусьцілі да ўдзелу ў Міжнародным конкурсе вакалістаў у Рыё-дэ-Жанэйра, а пасьля перамогі яна ўжо не належала сама сабе. Загадам Мінкульту СССР Шамчук накіравалі на працу ў Вялікі тэатар. А каб канчаткова забраць у прыгон, у 1978-м уганаравалі першай прэміяй і Гран-пры на Конкурсе імя Чайкоўскага. Дый яна на гэта заслугоўвала. У Маскве Шамчук сьпявала амаль усе вядучыя партыі, пераважна як дублёрка Абразцовай.

Масква адчыняла шлях на Захад. У 1980 г. Шамчук атрымала запрашэньне зь «Ля Скаля». Галоўны дырыжор Клаўдыё Абада ладзіў грандыёзны фэстываль на 100-годзьдзе сьмерці Мусаргскага. За сэзон мусілі быць пастаўленыя ўсе яго опэры. Шамчук дасталася загалоўная партыя ў ранняй опэры Мусаргскага «Салямба», потым роля Марфы ў «Хаваншчыне».

У 1986 г. у «Ля Скаля» адбылася рэвалюцыя: камуністычнае кіраўніцтва на чале з дырэктарам Паола Грасі мусіла сысьці. Хадзілі чуткі, нібыта «рука Масквы» тую дырэкцыю моцна падкармлівала, таму сьпевакі зь Вялікага ледзь не штомесяц атрымлівалі запрашэньні на галоўныя ролі ў «Ля Скаля». Абада зрабіўся музычным кіраўніком Венскай Опэры («Staatsoper»). І Вена неўзабаве сталася цэнтрам прыцягненьня для савецкіх сьпевакоў, якія пасьля разбурэньня «жалезнай заслоны» касякамі пацягнуліся на Захад.

Л.Шамчук зьехала адной зь першых, у 1989-м. Яна развітвалася зь Вялікім тэатрам, як дзяўчына развітваецца з абрыдлым інтэрнатаўскім пакойчыкам, беручы шлюб з багатым амэрыканцам. Перад тым яе некалькі разоў ня выпусьцілі на прэстыжныя гастролі, дый з галоўным дырыжорам Аляксандрам Лазаравым стасункі не складаліся. А тут Абада, Вена...

Зь ёй падпісалі кантракт на два сэзоны — акурат да 1991 г., калі пайшоў з пасады галоўны дырыжор Абада. Новаму кіраўніцтву Шамчук была не патрэбная — зьмянілася эстэтыка. Для выкананьня опэраў Моцарта і сучасных экспэрымэнтальных твораў цяжкаважныя «расейскія» галасы не прыдатныя. Што было пасьля 1991-га — сьпявачка распавядае цьмяна. Узгадвае выпадковыя спэктаклі ў розных тэатрах з рознымі дырыжорамі і партнэрамі...

Урэшце Шамчук вярнулася на Ўкраіну. Кінула кватэру ў Вене і задамавілася ў вёсцы, недалёка ад родных мясьцінаў: «Захацелася жыць дома, скінуць цяжар мітусьні». Рашэньне прыняла імгненна. Дадому ляцела з Гішпаніі чартэрным рэйсам, разам з аркестрам Данецкае Опэры. Там, ва Ўкраіне, жыў мужчына, які кахаў яе і чакаў яе цягам цэлага жыцьця. І гэта раптам стала найважнейшым. Менскім журналістам Шамчук пра гэта не распавядала, але ў жыцьці сапраўдных зорак не бывае таямніцаў.

**Юлія Андрэева**

## Хадановіч

**18 сакавіка** ў Доме літаратара (Фрунзэ, 5, вялікая заля) адбудзецца творчая вечарына Андрэя Хадановіча «Бабілёнскі праект». На імпрэзе будуць гучаць новыя вершы, песьні й пераклады, будзе прэзэнтаваная кніга «Лісты з-пад коўдры». Чакаюцца Ўладзімер Арлоў, Зьміцер Бартосік, Валянцін Акудовіч, Джэці й Віктар Жыбуль, Серж Мінскевіч, Алесь Пушкін. Пачатак а 18.30. Уваход вольны.

## Вясновая палітра

**З 3 да 14 сакавіка** ў Палацы мастацтваў (Казлова, 3) праходзіць «Вясновая палітра майстроў» — выстава-продаж аўтарскіх працаў мастакоў. Тут можна пабачыць і набыць жывапісныя й графічныя працы, скульптуры, шкло, кераміку. Час працы з 10-й да 18-й. Т.: 236-60-10.

## Сустрэча з Камоцкім і Паўлікавай

**6 сакавіка** (субота) літаратурна-мастацкая гасьцёўня «Маладзік» запрашае на сустрэчу зь Людмілай Паўлікавай і Алесем Камоцкім «Паэт і лампада». Вечарына адбудзецца ў Палацы дзяцей і моладзі (Старавіленскі тракт, 41). Праезд трамваямі 3, 4, 5, 10 да прыпынку «Палац моладзі». Уваход традыцыйна вольны. Пачатак у 15.00.

## АФІША

**Тэатар імя Янкі Купалы**

**7 сакавіка** (ндз) — «Смак яблыка» паводле А.Дзялендзіка.

**8, 9 сакавіка** (пн, аўт) — «№13 (поўная нісянеціца)» Рэя Куні (прэмія Лоўрэнса Аліўе як найлепшай ангельскай камэдыі 1991 г.).

**10 сакавіка** (ср) «Памінальная малітва» Шолам-Алейхема.

**11 сакавіка** (чц) — «С.В.» — плястычны спэктакль паводле «Вішнёвага саду» А.Чэхава.

**12 сакавіка** (пт) — «Кім» А.Дударава.

**13 сакавіка** (сб) — «Згублены рай» А.Курэйчыка.

**14 сакавіка** (ндз) — «Паўлінка» Янкі Купалы.

**Малая сцэна Купалаўскага**

**7 сакавіка** (ндз) — «Налу».

**12 сакавіка** (пт) — «Восеньская саната І.Бэргмана.

**13 сакавіка** (сб) — «Барух-Эмануэль» Дз.Плакса.

**Заля камэрнай музыкі**

**9 сакавіка** (аўт) у выкананьні арганіста Аляксандра Ісакава (Літва) прагучаць творы Баха, Рахманінава, Дзюпрэ.

**13 сакавіка** (сб) можна будзе пачуць праграму «Мастацтва харалу ў эўрапейскай арганнай музыцы».

**Опэра**

**6 сакавіка** (сб) — салісты, хор і аркестар тэатру ў сьвяточным канцэрце «Любімым жанчынам...». Дырыжор Вячаслаў Чарнуха.

**7 сакавіка** (ндз), раніца — «Пітэр Пэн».

**11 сакавіка** (чц) — Моцарт. «Чароўная флейта».

**13 сакавіка** (сб) — Вэрдзі. «Набука».

**14 сакавіка** (ндз) — Моцарт. «Вясельле Фігаро».

**Балет**

**7 сакавіка** (ндз) — «Жарсьці (Рагнеда)» Мдзівані.

**10 сакавіка** (ср) — «Рамэо і Джульета» Пракоф'ева.

**12 сакавіка** (пт) — «Марная перасьцярога» Герольда.

**14 сакавіка** (ндз) — Беласьнежка і сем гномаў» Паўлоўскага.

**Тэатар імя Горкага**

**11 сакавіка** (чц) — «Раскіданае гняздо» паводле Янкі Купалы.

**Малая заля тэатру імя Горкага**

**6 сакавіка** (сб) — «Сон на кургане» Янкі Купалы, містэрыя з працягам. Пачатак а 18.30.

**Цэнтральны Дом афіцэраў**

**6 сакавіка** (сб) — Аляксей Шадзько і «Сястра» прапануюць «Погляд назад». Квіткі каштуюць ад 6 да 14 тыс. руб.

**Канцэртная заля «Менск»**

**10 сакавіка** (ср) канцэрт Х'ю Ўіна і гурту «Арсэнал». Цана квіткоў ад 14 да 32 тыс. руб.

**13 сакавіка** (сб) — канцэрт Аляксандра Градзкага, прэзэнтацыя яго новага альбому «Хрэстаматыя». Кошт квіткоў ад 15 да 90 тыс. руб.

**14 сакавіка** (ндз) — канцэрт рок-гурту «The Stokes». Квіткі каштуюць ад 9 да 14 тыс. руб.

Пачатак усіх канцэртаў а 19-й.

## КІНААФІША

## «Оскары» ў Менску

У менскіх кінатэатрах ідзе кінапраграма «**Ляўрэаты і намінанты прэміі «Оскар**». Фільм «**Валадар пярсьцёнкаў: вяртаньне караля**», які ўзяў 11 «Оскараў», да 5 сакавіка паказваюць «Піянер» і «Камсамолец». «**Апошняга самурая**» з Томам Крузам у галоўнай ролі (4 намінацыі) паказваюць 1—8 сакавіка ў «Маскве» і «Кастрычніку». Мультфільм «**У пошуках Нэма**» (7 намінацыяў) — у «Аўроры».

9 сакавіка пачнуць паказваць камэдыю «**Цяжкасьці перакладу**» Соф'і Копалы (4 намінацыі). 22-га — псыхалягічную драму Вадзіма Перальмана «**Дом зь пяску й туману**» (3 намінацыі). Заплянаваны таксама паказ казкі «**Вялікая рыба**» (1 намінацыя), можна будзе яшчэ раз паглядзець драму «**Фаварыт**» (7 намінацыяў) і «**Гаспадара мораў**», які ўзяў 10 намінацыяў.

**«Аўрора»** (253-33-60)

«У пошуках Нэма» **5—8** (пт—пн) 11.00, 13.00, 15.00, 17.00.

«S.W.A.T.: Спэцназ гораду анёлаў» **5—8** (пт—пн) 16.10, 18.30, 20.40.

«Чумавая пятніца» **5** (пт) 19.00, 21.00; **6—8** (сб—пн) 14.00, 19.00, 21.00.

**«Берасьце»** (272-87-91)

«S.W.A.T.: Спэцназ гораду анёлаў» **5—8** (пт—пн) 16.40, 21.00.

«Лара Крофт: калыска жыцьця» **5** (пт) 18.50; **6—8** (пт—пн) 14.30 (іл), 18.50.

**«Кастрычнік»** (232-93-25)

«Апошні самурай» (прэм'ера) **5, 8** (пт, пн) 15.00, 18.00, 21.00; **6, 7** (сб, ндз) 15.00 (іл), 18.00, 21.00.

**«Масква»** (223-27-10)

«Апошні самурай» (прэм'ера) **5** (пт) 16.00, 18.30, 21.00; **6, 8** (сб, пн) 13.00, 15.40, 18.30, 21.00; **7** (ндз) 13.00 (іл), 15.40, 18.30, 21.00.

**«Мір»** (284-37-71)

«Іншы сьвет»*** (прэм'ера) **5—8** (пт—пн) 18.50, 21.10.

«Мішэль Вальян: прага хуткасьці» **5** (пт) 17.00; **6** (сб) 15.00; **7, 8** (ндз, пн) 15.00 (іл).

«К чорту каханьне!» **5** (пт) 18.10, 20.20; **6—8** (сб—пн) 16.00, 20.20.

«Жанчына француcкага лейтэнанта» **6** (сб) 18.00.

«Давайце спадзявацца, што будзе дзяўчынка» **7** (ндз) 18.00.

«Мулен Руж» **8** (пн) 18.00.

**«Перамога»** (223-77-66)

«Вельмі страшнае кіно-3»*** **5—7** (пт—ндз) 14.40; **8** (пн) 14.40 (іл).

«Летуценьнікі»**** **5—8** (пт—пн) 16.30.

«Дрэнныя хлопцы-2» **5—8** (пт—пн) 21.00.

«Кармэн» (прэм'ера) **5—8** (пт—пн) 18.45

**«Піянер»** (227-64-87)

«Валадар пярсьцёнкаў-3: вяртаньне караля» **5** (пт) 17.30; **6—8** (сб—пн) 15.30.

«Забіць Біла»****, фільм 1-ы **5** (пт) 15.30, 21.00; **6—8** (сб—пн) 19.00, 21.00.

**«Цэнтральны»** (220-34-16)

«Дзюплекс» **5** (пт) 11.00, 15.00, 19.00; **6, 7** (сб, ндз) 13.00, 17.00; **8** (пн) 12.00.

«Другі бок ложка»*** **5** (пт) 21.00; **6, 7** (сб, ндз) 19.00, 21.10; **8** (пн) 21.10.

«Старыя» (прэм'ера) **5** (пт) 13.00, 17.00; **6, 7** (сб, ндз) 11.00 (іл), 15.00.

(іл) — ільготны сэанс (зьніжка 50% для ўсіх гледачоў)

Рэйтынгавыя абмежаваньні:

*** — дзеці да 16 год не дапускаюцца;

**** — дарослым з 18 год.

## ДЗІЦЯЧЫЯ ІМПРЭЗЫ

**7 сакавіка** можна, на выбар, схадзіць зь дзеткамі ў Опэру, дзе даюць **«Пітэра Пэна»**, або ў Купалаўскі тэатар на мюзыкл **«Афрыка»**. У кінатэатрах **5—8 сакавіка** заплянаваныя наступныя дзіцячыя сэансы: у «Берасьці» а 12-й дэманструюць фільм **«Карлік Нос»**, паводле казкі Гофмана; у «Міры» а 13-й — **«Шрэк»**; у «Піянеры» ідуць два дзіцячыя фільмы: **«Ліла і Стыч»** (10.30, 13.50) і **«Пітэр Пэн у Нідзеляндыі»** (12.00).

## Дзіцячыя малюнкі

Выстава дзіцячых малюнкаў з конкурсу «Я беларус і гэтым ганаруся!» адчынілася 1 сакавіка ў менскім Музэі Багдановіча (вул. Багдановіча, 7а). На выставе паказаныя 45 малюнкаў 25 пераможцаў.

# 10 антыжанчын Беларусі

## З пункту гледжаньня антыжаночых стэрэатыпаў, сур’ёзна і ня вельмі

**Любы хіт-парад, а тым болей вызначэньне дзесяці знакавых жанчын краіны, патыхае суб’ектывізмам і нават трошкі карупцыяй. Таму лепш за ўсё адразу заявіць, што ты ў гэтай сфэры дылетант, або прапанаваць нейкі навуковы крытэр выбаркі. Напрыклад, клясыфікаваць усіх прадстаўніц жаночага полу ў адпаведнасьці стандарту прыгажосьці Наомі Кемпбэл. А паколькі зрабіць гэта эмпірычна — вялікі гемарой, я прапаную вывесьці гарачую абойму беларускіх фэмінаў па апазыцыі да самых папулярных антыжаночых забабонаў: якая беларуска і ў якой вобласьці найбольш падрывае падмуркі патрыярхальнай сьвядомасьці. Як казала вядомая фэміністка Вірджынія Вульф, «гісторыя антыфэміністкіх тэорыяў нават больш цікавая, чым гісторыя фэмінізму». У якасьці гіда ў сьвет патрыярхальнай думкі была выкарыстаная кніга Крысьціны Бард «Стагодзьдзе антыфэмінізму» (Fayard, Paris, 1999) і ўласьцівыя мне стэрэатыпы (мужык я ці не?!).**

### «Усе бляндынкі — дурніцы»



Ганна Кісьліцына

Тэорыя гопніцкага мачызму выведзеная ў побытавых анэкдотах кшталту “Як зрабіць, каб у бляндынкі гарэлі вочы? — Пасьвяціць у вуха ліхтарыкам”. Які аблом чакае пераносчыка такога кшталту стэрэатыпаў, калі ён сунецца да Ганны Кісьліцынай! Кісьліцына, літаратурны крытык, супрацоўніца Інстытуту літаратуры Акадэміі навук, адным толькі выразам «сэміялёгія ў яго яшчэ ня вырасла» можа прымусіць кавалера назаўсёды зразумець сваю гендэрную непаўнавартасьць.

Калясальнае значэньне Кісьліцынай для сучаснай культуры ў тым, што, разбураючы міт бляндынкі як істоты, абсалютна пазбаўленай рэфлексіўных здольнасьцяў, яна ствараe і рэпрадукуе новы правакацыйны міт белавалосай фурыі, пакідаючы мясцовых мача зь яшчэ больш непахісным перакананьнем: «Усе бабы — дурніцы». Але гэта ўжо гучыць з павагай.

### «Фэміністкі — замежныя агенткі і жыдамасонкі»



Наста Неказакава

Радзімай фэмінізму быў туманны Альбіён, таму ў шматлікіх краінах жаночы актывізм лічыўся інтрыгамі MI-5 або дзейнасьцю жыдамасонаў. Эдуар Друмон, актывіст французскай праварадыкальнай «Action Francaise», выбухнуў у 1907 г. патасным памфлетам «Du mariage», дзе намагаўся давесьці, што права на разводы, сьвецкая адукацыя для дзяўчынак і дашлюбныя сувязі — справа рук габрэйскага лобі, якое з часоў Дрэйфуса марыць парушыць палітычны мір і мэханізмы рэпрадукцыі французаў. Калі гэта так, усе тагачасныя агенты, або, лепей сказаць, агенткі масонаў і Даўнінг-стрыт — проста халтуршчыкі.

Прыблізна восьмі год жыве ў Беларусі расейская нелегалка Насьця Неказакава, якая прыклала руку да стварэньня такой колькасьці экалягічных, культурніцкіх і жаночых ініцыятываў, што на шпіёнскія ганарары павінна была, як той Бонд, даўно катацца на «Aston-Martin DB5». А яна ўсё тышчу страляе.

Пасьля краху Батысты Фідэль спэцыяльным дэкрэтам надаў Чэ Гевару кубінскае грамадзянства за ягоную ролю ў рэвалюцыі. Цікава, ці атрымае некалі Неказакава беларускі пашпарт за грандыёзны ўклад у моладзевы рух на «сінявокай»?

### «Жанчына і прагрэс несумяшчальныя»



ГЛЕБ ЛАБАДЗЕНКА

Вера Бурлак

Футурыстычны маніфэст Марынэці з пасажам аб няздольнасьці жанчыны быць у авангардзе зьменаў паставіў таўро на творчых здольнасьцях жанчынаў. На нашых артыстычных тусоўках гёрлы рэдка кажуць «Ты хто?» Часьцей — «Ты чыя?» Вера Бурлак (Жыбуль) — паэтка, аўтарка кнігі «За здаровы лад жыцьця» і рэдактарка рукапісных літаратурных часопісаў «Сельскія могілкі» і «Белачка», асьпірантка філялягічнага факу БДУ, сваёй творчасьцю нішчыць стэрэатыпы як пра жаночую паэзію, так і пра беларускае мастацтва ўвогуле. Калі бачыш яе выступы, думаеш: як добра, што Вера так позна нарадзілася. У савецкія часы яе схільнасьць да эпатажу і агрэсіўна-дынамічных паэтычных формаў паэзіі даўно ўжо выклікала б зацікаўленьне адпаведных органаў, яе стоадсоткава выслалі б з краіны. І цяпер ад Верыных вершаў тырчалі б ня мы, а разбэшчаныя дэкадэнты Бронксу.

### «Жанчына жыве ад 16 да 36 гадоў»

Гэта сказаў ня я, а Лімонаў, вядомы апанэнт жаночай эмансыпацыі. Тое, што ён нёс лухту, відавочна, калі глядзіш на Язерскую. Элеанора Язерская — тэлевядоўца і ўвогуле экстравагантная жанчына ў раскошы творчых плянаў. Улетку яна ходзіць у сукенцы з матроскім каўняром і капітанскай фуражцы з надпісам «Venezia», узімку — у футры зь невядомага футра, але зімой і ўлетку спрыяе разбурэньню стэрэатыпаў аб тым, што немаладая жанчына годная хіба што скардзіцца суседкам на балячкі. Цікава, што кажуць пра



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

Элеанора Язерская

Элеанору бабкі, якія лушчаць семкі каля яе пад’езду на плошчы Перамогі: «Глядзі, зноў паперлася на плястычную апэрацыю». Ну хіба Язерская — гэта ня ўдар па ўсіх беларускіх аматарах дамастрою?

### «Няроўнасьць жанчын і мужчын абумоўлена фізіялягічна»



PHOTO.BYMEDIA.NET

Яніна Карольчык

Найбольш зацяганая канцэпцыя антыфэмінізму. «Прыраўняць жанчыну і мужчыну — тое самае, што даць роўныя правы чалавеку і малпе», — пісаў у 1973 г. антраполяг Поль Тапінар. Пры гэтым ён абапіраўся на вынікі мэдычных дасьледаваньняў, якія даводзілі, што мозг у жанчыны меншы за мужчынскі, а фізычна прырода падрыхтавала кабету толькі для таго, каб нараджаць дзеці. Навука разьбіла гэтыя міты. У Беларусі жывой ілюстрацыяй гендэрнай роўнасьці, безумоўна, зьяўляецца Яніна Карольчык. Сваімі формамі і рэкордамі яна прымусіла прыкусіць языкі апошніх прыхільнікаў тэорыі фізіялягічнай няроўнасьці. Спачатку закінь так далёка ядро, а потым кажы пра другасортнасьць жаночага арганізму.

### «Функцыя жанчынаў — сядзець дома, роля мужчынаў — ваяваць»



«БДГ»

Ціна Клыкоўская

Гэтым тэзісам Клемансо адмаўляў жанчынам у праве быць абранымі ў парлямэнт. «Калі мы абяром жанчын дэпутатамі, краіна згубіць баявы дух», — казаў Тыгр. Магчыма, сярод французжанак так і было, аднак пра сёньняшніх беларусак такога не скажу. Адна Клыкоўская, беларуская Навадворская, каштуе батальёну такіх мужчынаў, як я. Ніколі не сустракаў больш эксцэнтрычнай жанчыны, гатовай ахвяраваць сабой за палітычныя ідэалы. Ці ж можна забыць, як у гарачыя дні 1996-га Ціна зьбірала па тусоўцы грошы: «У мяне ёсьць знаёмы кілер у Сьвярдлоўску, які за 10 000 даляраў вырашыць галоўную праблему беларускай дэмакратыі». Усе круцілі пальцам. Напрыканцы Ціна плюнула, вырашыла зачараваць свайго снайпэра нематэрыяльным фактарам і зьехала на Урал аўтастопам. Так і ня ведаю, што было далей. Потым я бачыў яе ў кампаніі з усімі экстрэмістамі гэтай краіны і бліжэйшага замежжа. Апошні раз, калі яна вярнулася з Грузіі, намякала мне пра хуткую рэвалюцыю ва Ўкраіне. Раю беларускім дэмакратам на наступны дзень пасьля перамогі ізаляваць Ціну або загнаць пасьлікай у адну з афрыканскіх краінаў. Зь яе наркатычнай прагай барацьбы яна абавязкова ўзначаліць штаб за рэстаўрацыю Лукашэнкі.

### «Гістэрычнасьць і нэрвовасьць – галоўная рыса жанчыны»



Тамара Віньнікава

Жаночая натура — гэта заўсёдная барацьба паміж атрыманай у спадчыну ад Евы пажадлівасьцю і вонкавымі нормамі грамадзкіх паводзінаў. Адсюль нэрвовасьць і гістэрычнасьць. Тэарэтыкі правых — Ота Вайнінгер, Эрнст Генон і Аляксандар Дугін — бездань старонак прысьвяцілі нэўрозам жанчыны і халоднай вытрымцы мужчынаў. Ой, ня ведаю. Ніколі не забуду трансьляцыі сэлектарнай нарады гадоў пяць-шэсьць таму, калі Нацбанк узначальвала Тамара Віньнікава. Як толькі зьявіўся Сам, халодныя вытрыманыя мужчыны-міністры пачалі нэрвозна торгацца і канспэктаваць кожнае слова гаранта, быццам заўтра «СаўБелка» не перадрукуе сьпічу даслоўна. І толькі Тамара Віньнікава, спакойная, быццам сьфінкс, сядзела і, часам правакацыйна пазяхаючы, разглядала свой манікюр. Вось гэта сапраўдная вытрымка джэнтэльмэна!

### «Мацярынства — натуральны сродак ад пазасямейнай актыўнасьці»

Як ні дзіўна, Мапасан, аўтар шматлікіх прагрэсіўных рэчаў, у салёнах фэміністак лічыўся першым казлом. У навэле «Нядзеля парыскага буржуа» ён малюе мітынг фэміністак як збор старых дзеваў, якім не пашчасьціла нарадзіць дзіця. Ляйтматыў твору Мапасана і іншых мачыстаў сёньня і тады: калі ў суфражысткі будзе бэбі, яна паразумнее, з галавой аддасьць сябе мыцьцю шкарпэтак і гатоўцы. Грыбалёва публічна парушыла стары міт. Самая раскручаная айчынная попзорка першае, што зрабіла пасьля нараджэньня дзіцяці, — выпусьціла музычны альбом (ня будзем гаварыць пра яго мастацкія вартасьці). Цяпер у кожнай кабеты, якая выпад-



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

**Ларыса Грыбалёва**

кова заляцела ў росквіце творчых сілаў, ёсьць цудоўны жыццёвы эталён, каб сказаць самой сабе: «Дзіця — гэта не праблема для кар’еры. Жыцьцё працягваецца».

### «Жанчынам-палітыкам патрэбная ўлада, каб пазьдзекавацца з мужчынаў»



**Лідзія Ярмошына**

Адзін з самых вядомых карыкатурыстаў у гісторыі Альфонс Дадэ аднойчы выпусьціў спэцыяльную сэрыю малюнкаў на тэму «Як будзе выглядаць грамадзтва пасьля прыходу да ўлады жанчын». На яго думку, гэта будзе сапраўдны генацыд самцоў: жанчыны, аб’яднаныя ў сакрэтны антымужчынскі саюз, прымусяць іх прыбіраць, гатаваць, шыць, а самі будуць кіраваць. Лідзія Ярмошына — найлепшы контраргумэнт алдовым антыфэміністам. Колькі гадоў спн.Ярмошына руліць выбарамі, а жанчынаў ва ўладзе — кот наплакаў. Дый тыя за правы кабетаў ня вельмі падрываюцца. Мужыкі, сьпіце спакойна — ніякай антымужчынскай змовы не існуе.

### «Жанчына — гэта жанчына. Мужчына — гэта мужчына»



**Вава**

Апошні доказ мачыстаў, калі няма іншых аргумэнтаў, каб абараніць свой аўтарытэт. Хто ў такім выпадку Вава? Зорка беларускай трансвэстыцкай сцэны, ляўрэат конкурсу «Дзіва». Мужчына, які пры сустрэчах больш нагадвае дзяўчыну. Ён яшчэ не перамяніў полу, але гэта ўжо марфалягічная дэталі. Ня ён, дык іншы беларус зробіць гэта. Вава найбольш дэманстратыўна заявіў, што такі пераход магчымы. Новая катэгорыя беларускіх жанчынаў — былыя мужчыны... У галаве не зьмяшчаецца! Магчыма, мы дажывём да часу, калі «Наша Ніва» будзе складаць дзясятку самых папулярных трансвэстытаў краіны.

**Лёлік Ушкін**

**Возьмем за пункт А 1900 г., за пункт Б — 1999 г. і зьмерым адлегласьць, якую прайшлі жанчыны шляхам эмансыпацыі за сто гадоў. Вынік будзе адпавядаць суме некалькіх даўнейшых сто-, а то й тысячагодзьдзяў. У ХХ ст. на гістарычную сцэну ўпершыню выйшлі гераіні. Іх лёсы прамовіста сьведчаць пра тое, што сацыяльныя, нацыянальныя і эмансыпацыйныя ўзрушэньні былі ўзаемна абумоўленыя. Кожнае дзесяцігодзьдзе — як чарговая прыступка — несла зьмены, адмаўленьне парадку, які склаўся быў напярэдадні, руйнавала сьветапогляды. Адпаведна зьмяняліся і гераіні.**



**Цётка**



**Палута Бадунова**



**Паўлінка**



**Натальля Арсеньнева**



**Ларыса Александроўская**



**Зінаіда Бандарэнка**



**Ларыса Геніюш**



**Валянціна Церашкова**



**Ала Пугачова**



**Алена Мазанік**



**Натальля Шаўко**

# Жанчыны выходзяць з-пад кантролю

## Стагодзьдзе ў тварах

### Пачатак: Цётка

Па гадох Алаіза Пашкевіч магла б быць Багушэвічавай дачкою. Яе часам быў пярэдадзень падзеньня імпэрыяў. Паэтка, заснавальніца Беларускае сацыялістычнае грамады, настаўніца, карэспандэнтка «Нашай Нівы», акторка ў Буйніцкага, аўтарка дзіцячых чытанак, выдаўніца першага часопісу для моладзі, фэльчарка ў псыхіятрычнай лякарні, у час вайны санітарка ў тыфозным бараку… Першая яна казала пра неабходнасьць працаваць з жанчынамі, пра іх вызначальную ролю ў барацьбе за вызваленьне народу. Але першай барацьбітцы за вызваленьне беларускіх жанчынаў даводзілася аддаваць даніну й патрыярхальнасьці грамадзтва: «Цётка» — адзіны яе жаночы псэўданім. Астатнія дваццаць восем — мужчынскія.

### 10-я: Палута Бадунова

З сынкрэтычнае культурніцка-адраджэнскай дзейнасьці яна хутка выкрышталізавала для сябе палітыку. І — першая сярод жанчынаў — займалася ёю прафэсійна. ЦК Беларускай сацыялістычнай грамады, Рада БНР, ЦК партыі эсэраў. Як многія калегі, адчуўшы «закручваньне гаек», ад’ехала за мяжу. Як многія калегі, вярнулася ў беларусізацыю з Прагі ў Гомель. Фінал тыповы: расстрэл у 1937-м, рэабілітацыя ў 1989-м.

### 20-я: Паўлінка

Беларусізацыя, каранізацыя, адукацыя, эмансыпацыя вывелі на гістарычную арэну сялянскую дзяўчыну, адкрылі перад ёй заказаныя раней шляхі. «Я калгасьніца маладая, жыву весела, ані дбаю», — загалосіць Паўлінка гадоў празь дзесяць.

### 30-я: Ларыса Александроўская

«У геніяльнай сьпявачкі, узьлёт якой прыпаў на сталінскія часы, быў не такі ўжо й багаты выбар. Або стаць ахвярай палітыкі, або — трыюмфатарам мастацтва. Яна выбрала апошняе, і ёй гэта ўдалося. Ёй выпала стаць увасабленьнем шчасьлівай савецкай Беларусі, якая не зважае на масавыя рэпрэсіі, прыватныя чалавечыя трагедыі і татальную русіфікацыю. Яна сьпявала Сталіну пра Беларусь. Яна сьпявала дэлегатам XVI зьезду КПБ: Чарвякову, які праз тыдзень скончыць жыцьцё самагубствам, Галадзеду, які выкінецца з акна будынку НКВД, Шаранговічу, якога расстраляюць, як і большую частку дэлегатаў таго зьезду... Яна сьпявала ім «Бывайце здаровы». Гэта была прэм’ера песьні», — піша Сяргей Дубавец.

### 40-я: Натальля Арсеньнева і Алена Мазанік

Два жаночыя лёсы часоў вайны. Першая, верная жонка, прайшла праз высылку ў Казахстан і пасьля прыходу нацыстаў безальтэрнатыўна абрала «меншае зло». Назаўжды страціла сына, а пасьля радзіму. Другая, закладніца спэцслужбісцкіх гульняў, забіла Кубэ, стала Героем Савецкага Саюзу і да скону распавядала піянерам пра тое, як гэта зрабіла. Бог даў абедзьвюм доўгі век.

### 50-я: Ларыса Геніюш

«Не пазнаю цябе, мой Краю, нявечыць людзкасьць лад чужы», — пісала паэтка, вярнуўшыся з ГУЛАГу. Да канца жыцьця Геніюш мучылася на вуліцы Савецкай у Зэльве. Без грамадзянства — савецкага ня брала, як ні ўпрошвалі дабрадзеі, — і рэабілітацыі, адарваная ад сына. Ратавалі нязломны характар і шчырая рэлігійнасьць. Як і ва ўсіх жанчынаў таго часу, у яе ставала сілаў і для іншых. Каб ня Геніюш, ня сталі б тым, кім сталі, Караткевіч, Ермаловіч.

### 60-я: Валянціна Церашкова

Першая жанчына ў космасе. Ідэальная савецкая піяр-акцыя. На гэтую бясстрашную пасьпяховую жанчыну раўняліся і мільёны беларусак у сваім імкненьні стаць ідэальнымі савецкімі жанчынамі. Адбудаваная пасьля вайны краіна мадэрнізоўвалася. Беларускі ехалі на цаліну і прабіваліся ў лётчыцы. Вырваўшыся зь вёсак і мястэчак, яны захапляліся вялізнай савецкай краінай, сваім слаўным новым сьветам. Варта адзначыць яшчэ, што Церашкова мае беларускія карані па мячы і па кудзелі. Церашкова дала калясальны штуршок жаночаму руху ва ўсім сьвеце, узмацніла сымпатыі да СССР. Пакаяцца за тыя авансы эўрапейскія левыя інтэлектуалы наважыліся толькі сёлета: фільм «Нашэсьце барбараў», які адлюстроўвае крах іх ілюзіяў, атрымаў «Оскара».

### 70-я: Ала Пугачова

Першы савецкі маскультавы ідал, увасабленьне прэстыжнай «гарадзкой» культуры. Была запамінальная і прыцягальная, бо, апроч легкаважна-незаідэалягізаванага рэпэртуару, несла рэдкае тады адценьне сэксуальнае свабоды. Культавая сьпявачка пакаленьня, што пачало расчароўвацца ў камунізьме, але таксама няўхільна ператваралася зь беларусак у савецкіх жанчынаў.

### 80-я: Зінаіда Бандарэнка

Цнатлівы і сумленны беларускі ідэал. Прадукт эпохі Машэрава, які пад строгім партыйным кантролем узгадоўваў і песьціў беларускія культуру і нацыю. Сымбаль эпохі, калі вады са студні не пілі — куплялі мінэралку ў краме. Увасабленьне спакою і дабрабыту позьняе БССР.

### 90-я: Натальля Шаўко

Бізнэс-вумэн, рызыкантка, кіраўніца кампаніі «Фіко», фундатарка часопісу «Унія». Была тварам беларускага нацыянальнага бізнэсу, разагнанага ў першыя гады праўленьня Лукашэнкі. Як і многіх папярэдніц, лёс прывёў яе ў Прагу — праз скандал, судовую справу й эміграцыю. Цяпер працуе на радыё «Свабода».

**Сяргей Мікулевіч**

**Даўно мінулі тыя часы, калі пільныя мамкі крычалі сваім наццацігадовым дочкам: «Што эта ў цібя за беспарадак такой?», абгрунтоўваючы сваю незадаволенасьць фэнамэнальнай фразай: «Ты жа дзевачка». Цяпер гэтая фраза выглядае вельмі нясвоечасовай, прымаючы ў разьлік, што мала якая «дзевачкай» да тых гадоў дажывае. Сёньняшнія дзяўчаты — ужо ня іх мамы, аднак яшчэ й не перараскамплексаваныя дзявулі з амэрыканскага тэлемыла. Яны заселі недзе пасярэдзіне: занадта эўрапейскія, каб не спакусіцца на ідэі фэмінізму, і адначасова занадта прыціснутыя старымі забабонамі іх «маладзяшчыхся» мам, каб дазволіць сабе раскошу вырашаць усё за дваіх і атрымліваць ганарары, разы ў тры вышэйшыя за заробак мілага. Або, прынамсі, каб прызнацца яму ў гэтым.**
**Часам стэрэатыпы — апошняе, што яшчэ змушае згуртоўвацца па два. Магчыма, гэта апошняе, што дазваляе насельніцтву краіны з горам папалам папаўняцца. Шанцаў зламіць сёньняшнюю выхаванку мэгаполісу і прывучыць яе да поўнага набору пральна-гатавальных абавязкаў робіцца ўсё меней. Шанцы знайсьці і зразумець — пакуль што ў кволай наяўнасьці.**
**Адзін зь нешматлікіх у краіне мільянэраў, наш горад за дзесяцігодзьдзе выхаваў зусім новую лігу патэнцыйных чэмпіёнак у сваёй справе і па жыцьці. Узрошчаныя на рэзкіх кантрастах, хісткім матэрыяльным становішчы, супярэчлівых каштоўнасьцях і падвоенай порцыі асабістай свабоды, пры досыць паверхоўным разглядзе дочкі мэгаполісу падзяляюцца на пяць тыпаў.**



Багемныя тыпажы

# Выхаваньне дзяўчынак у мэгаполісе

## Свая дзеўка

**Дзе шукаць:** у калямузычных тусоўках. Мае звычку прыносіць хатнія саляты і бабуліну піцу на рэпэтыцыі. У суботы тусуецца ў клюбе NC або запрашае ўсіх да сябе на флэт, дзе ўсе напаўведаюць адно аднаго.

**Як выглядае:** нядзельнай раніцою ў ложку з пляшкай мінэралкі — няважна. Увогуле — ярка і весела. Не баіцца экспэрымэнтаваць з валасамі, у шафе ўтрымлівае 10 пар каляровых «селядцоў», а таксама шмат рэчаў, набытых на сэзонных распродажах у «Extra», «United Colours of Benneton», «Miss Sixty» («Vero Moda», «Only», «Ravel», «MNG» — у выпадку калі свая дзеўка выяжджае за мяжу).

**Пра што марыць:** зрабіць ціхую рамантычную вечарынку пры сьвечках tete-a-tete з найлепшай сяброўкай. Жыць без бацькоў або каб іх падоўгу не было дома. Каб можна было паліць на кухні.

## Зьвязда цэнтравая

**Дзе шукаць:** на цэнтры. А таксама там жа, дзе і сваю дзеўку, толькі ня побач зь ёй. Звычайна зьяўляецца пэрманэнтнай дзяўчынай якога-небудзь мясцовага аўтарытэта («легендарная пара, разам са школы…»), ходзіць побач зь ім, размаўляе мала і пераважна пра яго, сьмяецца шмат і пераважна зь яговых жартаў, зь іншымі паводзіць сябе фанабэрыста.

**Як выглядае:** як з рэклямы касьметыкі Pupa. Модна. «З іголкі». Мае шмат вопраткі і набывае яшчэ больш. Умее хадзіць на нязручных шпільках і танчыць у цесных джынсах. Сочыць за фігурай, пры сабе цягае пару-тройку непрыгожых сябровак. Для кантрасту.

**Пра што марыць:** пра сьвецкія вечары зь «вяршкамі» Minsk-city. Пра шыкоўныя апартамэнты на праспэкце Скарыны, а лепш у Гішпаніі. І каб тата ўрэшце набыў ёй прэзэнтабэльнейшую тачку.

## Дівчина з іншого життя

**Дзе шукаць:** там, дзе больш нікога няма. Падыдзе дах спальнага хмарачоса на Макаёнка а 4-й раніцы. Таксама можна паспрабаваць, паехаўшы ў грыбы ў студзені, або на магілёўскай трасе па завеі — будзе шукаць у сьнезе сьляды леташняй стаянкі UFO або адаптоўваць налоўленых у пад'ездзе мушак да ўмоваў беларускай зімы.

**Як выглядае:** незвычайна. Дзіўна. Цікава. Можа мець, што заўгодна: і боты, пафарбаваныя лякам для пазногцяў, і начны каўпак на галаву з умантаванай антэнай для прыёму іншапланэтных сыгналаў.

**Пра што марыць:** каб дагэтуль не зусім удала праектаваныя палёты з шафы скончыліся фантастычным прызямленьнем на якім-небудзь спадарожніку якой-небудзь планэты. Каб кругі, якія разыходзяцца ў калюгах у дождж, разыходзіліся марудней, як пры запаволеным прагляздзе. Навучыць братавага тэр'ера размаўляць сваім голасам, каб дома яе даўжэй не хапаліся.

## Кар'ерыстка

**Дзе шукаць:** яе ня любіць ніхто, апроч дэканату. Там і шукаць. Яшчэ ў бібліятэках гораду (ня блытайце з on-line libraries — кар'ерыстка звычайна з Інтэрнэтам на «Ваша сьветласьць») і іншых месцах, дзе можна вучыцца-вучыцца-вучыцца, пісаць вялізныя рэфэраты па нікому не патрэбных прадметах ад рукі і набіраць стос карыснай літаратуры на дом. За сабою водзіць якую-небудзь ціхую асобу, якая патаемна марыць сябраваць са сваімі дзеўкамі і дзяўчатамі «пры мастацтве» (пра гэтых ніжэй).

**Як выглядае:** устойліва. Стаіць на нагах, апранаецца, як ейная маці: цёпла, практычна і непрыгожа. Валасы (звычайна) нястрыжаныя зь незапамятных часоў. Не фарбуецца, часам дазваляе сабе дурацкія кітайскія каляровыя заколкі. Са стыпэндыі набывае неабходную драбязу, ніколі ня пойдзе бязмэтава траціць хаця б і 5 тысяч БРБ.

**Пра што марыць:** пра пасаду. Пра кабінэтную добра аплатную працу. Пра пяць гадоў плятанічнага сяброўства з «культурным» хлопцам пры гальштуку, які «падае надзеі». Каб хадзіць зь ім у опэрны і вазіць яго знаёміцца з усімі сваімі стрыечнымі цёткамі. Пра вясельле ў фінале.

## Дзяўчына «пры мастацтве»

**Дзе шукаць:** яна знойдзе сама. Такога, якога ёй трэба. Калі нічога ня выгарыць, праплача двое сутак, а пасьля зоймецца справамі. Калі ня вучыцца непасрэдна ва ўстанове з мастацкай спэцыялізацыяй, то нейкай пэўнай творчасьцю займаецца сама і тое ёй удаецца. Зрэшты, дзяўчаты «пры мастацтве» звычайна адораныя ўва ўсім, дзе патрабуецца суб'ектыўны пагляд і высокі каэфіцыент разьняволенасьці. За сабою прыносіць сьвежасьць і ўменьне дзівіцца са звычайных рэчаў.

**Як выглядае:** адпаведна сваіму сёньняшняму душэўнаму стану. Ведае, што значыць «модна». Апране гэта, толькі калі «яно» падыходзіць да ўсяго іншага, якое НЕабавязкова падыходзіць да агульнага выгляду жыхароў мэгаполісу. Увогуле зазвычай апранаецца густоўна і гіпэрутульна. Любіць ублытваць у валасы розныя фосфарныя зоркі, а на шыі насіць амулет з ракавінак, сабраных летась у Міжземным моры.

**Пра што марыць:** Скатацца ў Румынію на Каляды, набыць зялёныя аўганскія нагавіцы, зьмяніць сьвет. Стварыць што-небудзь істотнае і атрымаць прызнаньне. Быць цікавай навакольным. Каб, калі яна паліць сьвечкі і слухае Шапэна, ніхто не ўлятаў у пакой зь ляманітам: «Кууууууууушаць будзеш???»

**Тэда Лі**

# Зіму перажылі

апавяданьне



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

## У краінах, дзе пілуюць туі, ніколі не хапае хлеба

Прырода такая простая. Яна любіць раскідаць свае далонькі.

— Якія далонькі?

— Восеньню — пяціпалыя. Зімою — шасьціпалыя.

«Вецер падзьмуў спачатку ў дудачку. Потым у дудку. Затым — у дуду».

І вось калі вецер зароў у дуду, тут і прыйшла яна, Князёўна Зіма Дзьветысячычацьвертая Бездакорная. Людзі цялёпкаюцца ў складках ейных строяў. Выразны малюнак гальля на сьнезе, лупаты Месяц, бы акрывелая сава. Маё сэрца нехта п'е праз саломінку, і яго засталося мала, а тое, што засталося, цягуча й балюча ўздымаецца ўгару — у Твой рот. Тлумачэньня гэтаму няма.

Янін сусед — былы міліцыянт, а цяпер піраман і дрэваненавісьнік зь белым білетам. Поначы ён падпальвае людзкія дзьверы і пілуе дрэвы — выключна высакародныя, таполяў ды бяроз не чапае. Уначы нягоднік сьпілаваў перадапошнюю зь Яніных дзесяцёх туяў. Акно згалела й злысела. І месяц часьцей зазірае, і жыватастыя сарокі перасталі віцца. Звалілі сарокі. А былі гэта самыя прыгожыя птушкі на сьвеце: вееракрылыя, прастахвостыя, чорнабелыя, графіка сёлетняй зімы.

Яна настукала на суседа ў міліцыю, але міліцыянты не зачапілі былога калегу. І праўда, хто будзе клапаціцца пра тую тую — у краіне цяжкое становішча, на хлеб не хапае. У краінах, дзе пілуюць туі, ніколі не хапае хлеба. Гэта ясна як дзень, але свайго розуму нікому ў галаву не ўваб'еш.

Яна стаіць на гаўбцы і лічыць пянькі, папіваючы каву з носіка заварніка. Ніколі не спрабавалі? Глыточкі дробныя, у доўгім скрыўленым носіку гулка булькае, быццам кальян паліш. А галоўнае — можна піць краёчкам роту. А калі хочаш скорчыць сусьвету казіную морду, то піцьцё кавы крывым ротам — самая справа.

Часам хочацца сысьці дамоў. У сапраўднае дамоў. Чарговы мужчына пакуецца ад Яны прэч. Настрой у яго сварлівы.

Ты эгаістка. Хочаш па-кепскаму — сыду па-кепскаму. Аддавай, не марудзячы, мае рэчы.

Бяры.

Стаіць з заплечнікам, цьвеліць бровы, думае, чым зачапіць.

І карціны твае гаўно! Не пішы болей, бо ня ўмееш, колькі ні дзярыся! Глядзіш сабе ў пуп і думаеш, што гэта пуп зямлі.

Яна сапраўды так думае.

Гэты хлопец біць ня ўмее. От, называецца, дадзеў! Яна ўсё ведае пра сябе й сваю пісаніну. А сама Янка трэснула яго лепей, таму што мужчын біць лёгка: толькі адбяры ў іх перамогу. Паранілі цябе — адкінь іх, як вепр адкідае сабак. І ідзі сабе далей. Быць сьвіньнёй — крайне прыемна, хаця не заўжды проста.

Яна зьведала лепшых мужчын сваёй краіны, некаторых і ў біблійным сэнсе. У іх усё ў парадку з розумам і патэнцыяй, іхныя хаты ломяцца ад паліц з кнігамі. Але Яна любіць мужчын, схільных да пэрманэнтных выбрыкаў на мяжы асобы. Схільных да ўнутраных інтэлектоўных і эмацыйных прыгодаў. А тыя сьпяць у сваёй абалонцы, як немаўляты. Таму Яна страціла цікавасьць і валачэцца па горадзе, не падымаючы вачэй, быццам капае труфэлі.

Яна пашырала сьвядомасьць у «Тройцы» з дапамогаю зуброўкі. Пасябравала зь нейкімі тынэйджэрамі і пачала іх таксама вучыць пашыраць сьвядомасьць. Дайшлі да таго, што тынэйджэры сталі падкідаць яе на рукох зьнізу ўверх наўскасяка, да закуранай троечнай столі. Не ўтрымалі, і Яна сплянавала на стол з аб'едкамі. Калі п'еш, жыцьцё вакол — як у замаруджаных здымках. І акуляры Яніны сплянавалі ды бразнуліся аб краёк фаянсоўкі з салатаю. Пырснула шкло. Так апасродкавана рэалізуецца лёзунг «морды — у салату». Вечар пара было закругляць. Матэрыялізаваўся нехта, хто клапатліва павёў да выхаду. Пасадзіў у таксоўку й зьнік. Ланцужок п'яных дзівосаў.

Уначы Яна сасьніла, што некалькі мужчын саджаюць высокія туі, а яна стаіць на гаўбцы, папіваючы каву зь імбрычка. На тым баку вуліцы вялізная малпа спрабуе згвалціць жанчыну. Ад групы рабочых аддзяляецца высокі мужчына ў зялёным, як мох, аксамітным строі і з каштанавымі кудзеркамі да сярэдзіны плечаў. Кудзеры доўгія, але ня тлустыя, а гэта не абы-якое дзіва. Ён кінуўся ратаваць жанчыну, не рагатаў і ня торкаў пальцам у сакавітае здарэньне, як сябручкі. Ён разьбіў малпу аб мур, пагладзіў жанчыну па шчацэ і пайшоў ізноў саджаць туі. Яна кінула імбрык і саскочыла з гаўбца. Лёгка саскочыла, таму што яна чакала падставы лёгка саскочыць. (Саскочыць можна і з гатэлю «Беларусь», было б толькі, дзеўкі, дзеля чаго.)

— Гэй! — крыкнула Яна. Ён спыніўся й цалкам павярнуўся — з той падсьвядомай, каралеўскай пачцівасьцю, якое наяве ня ўбачыш. Глядзеў адным вокам. З твару ён таксама аказаўся валасаты — кучаравая бародка, вусы, пасма закрывае правы профіль. Яна падумала, што ён аднавокі. Яна не магла разгледзець, сапраўды гэта патрэбны мужчына ці зноў нейкі пабытовы варыянт. І папрасіла: дазвольце разгледзець Ваш твар. Ён паважна й трохі сьмяшліва кіўнуў. Яна прыціснулася да яго й адвяла валасы з вока. Твар аказаўся тварам патрэбнага мужчыны. А цела Яне не спадабалася: вузкае, тонкае. Які жаль, гэта Дон Кіхот! Але гэта быў менавіта той мужчына. «Ты не зманіў», — падумала Яна. У адхіне каўняра яна пабачыла — ён носіць пірсынг. А гадочкаў яму ня менш за сорак пяць. Прыціснулася да яго мацней і сказала: «Я ваш варыянт?» — «Дурное пытаньне», — адказаў ён. Ягоная пасма спаўзла на вока зноў. Ён мякка паклаў на Яну рукі, быццам зьбіраўся танчыць. Гэта было адчуваньне, быццам ты патрапіла ў сьвет, створаны паводле тваіх уласных крывых лякалаў. Ня трэба вяртацца ў Менск, Беларусь, вул.Брыкета, месца адвечных кампрамісаў. Яна толькі была расчараваная тым, што ейная асоба споўнілася праз мужчыну — так звыкла, так плоска. Бабы ня могуць споўніцца самі празь сябе, а толькі сканэкціўшыся з героем. Але хай: тушкай ці пудзілам — ты патрапіла на той сьвет і атрымала таго мужчыну.

І тут Янаочку разбудзіў — так, о жах, гэта быў сон! — страшны грукат на гаўбцы. Ідыёт сьпілаваў і падпаліў апошнюю тую. Туя Палянская, Сястра Апошняя, бразнула аб гаўбец, пабіла бутлю з вымаразкамі й сарвала мацерыну паляндвіцу. Янка ўмэнт страціла ўсё!!! — тую, марожаную гарэлку, сарок, вераб'ёў. І новы сьвет пад новым небам.

Вось, значыць, як Ты са мной. Але падману тут не было. Гэты сон важнейшы, чым усе каханкі, складзеныя ў кучу.

Вечарам яна зноў пайшла ў «Тройку». Два разы запар «Тройка» можа й забіць, але яшчэ больш дастаюць сёньняшнія страты. Заля для палёнцых гула, забітая пад завязку, а заля для непалёнцых была пустая, толькі ў куце спаў нейкі п'янтос. Яна ўзяла дзьве стромыя чырвоныя адвёрткі, села тварам да акна, абчаплянага ланцугамі. У зрэнку патрапілі месяц, калматая елка ля францускае амбасады, вечаровае неба, банальнае і напышлівае, як афіцэрская парадка з пагонамі. Пад елкаю непарушна сталі нахохленыя міліцыянты. Služкі, бацькі й мужы. Будучыя піраманы. Адвёртка пачала ператвараць сьвет у ружовы бардэль. Гэта добры, міласэрны момант. Мільёны п'яніц зразумеюць мяне.

Валацуга паварушыўся і падняў галаву. О! Гэта быў Зялёны чалавек, толькі мёртва п'яны!!! І валасы ў яго аказаліся тлустыя, як ва ўсіх доўгавалосых мужчынаў (абменныя працэсы ў іх занадта актыўныя). І касьцюм не аксамітны, а скураны. І пірсынг не ў грудзёх, а ў носе. Але валасы гэтак жа закрывалі паўтвару. І штаны пабраліся ў зморшчкі на вузкіх клубах. А галоўнае — нават абсалютна п'яны, ён захоўваў несьвядомае высакародзтва, пачцівасьць да ўсяго сьвету! Яна паднялася й хіснулася ад грэйпу, зьмяшанага з хваляваньнем. Падышла да яго й сказала:

— Можна мне разгледзець Ваш твар?

Ён нічога не адказаў, і гэта было несупадзеньне. Але глядзеў пачціва й сьмяшліва, як у сьне. Яна падняла руку й адсунула валасы. На яе зірнула аточанае чорнымі вейкамі зялёна-блакітнае вока, але яно было ня доўгае, як беларускае возера, а длинное, менавіта длиинннnнное, liiiiinnnng, бясконцае, вымаляванае нетутэйшым пэндзлем.

Усё было добра, расказваць ня будзем. Шкада, што яна ня памятае, як ён зьнік... Дакладна ня ведаю, ці быў ён увогуле, альбо ягонае зьяўленьне — вынік пашырэньня Янінай сьвядомасьці.

Яна сьніць яго часта, свайго Зялёнага Чалавека. Быццам ён дражніцца пад вакном: «Рапунцэль, Рапунцэль, прачнісь! Спусьці свае косачкі ўніз».

А няма ў яе ніякіх косачак! Іх сьпілаваў п'яны піраман. Спускаць няма чаго. Зялёнаму Каралю не забрацца ў акно.

Давядзецца нам спусьціцца да яго. Шляхам алькагалізацыі.

Жыве Беларусь!

**Ева Вежнавец і ейныя сёстры**

Студзень 2004

## НОВЫЯ КНІГІ, ДАСЛАНЫЯ Ў РЭДАКЦЫЮ

**Боська У. Віртуальныя запалкі.** — Менск: Логвінаў, 2004. — 70 с. 200 ас.

Чарговае выданьне з сэрыі «Другі фронт мастацтваў». У «Акадэмкнізе» і «Кнігарні пісьменьніка» цана блізу 4000 руб.

**Якуб Колас. Вянок з аблокаў:** Вершы, урыўкі прозы. — Менск: Беларускі кнігазбор, 2003. — 72 с.: іл. 1000 ас.

Выданьнем прыродаапісальных вершаў і ўрыўкаў з празаічных твораў клясыка распачынаецца літаратурна-мастацкая сэрыя, прысьвечаная нёманскаму краю. У ёй плянуецца выхад кнігаў Л.Геніюш, А.Русака, сучасных аўтараў, што належаць да «нёманскай школы».

**Раманюк М. Беларускія народныя строі** / Падрыхт., падбор ілюстр. і маст. афармл. Д.Раманюка; Рэд. С.Дубавец. — 2003. 2500 ас.

Гэты густоўна аздоблены альбом утрымлівае квінтэсэнцыю зробленага Міхалам Раманюком. Цягам болей як трыццаці гадоў дасьледчык дбайна зьбіраў і сыстэматызаваў зьвесткі пра беларускае народнае адзеньне, клясыфікаваў традыцыйныя строі паводле рэгіянальнай прыкметы. У выданьні зьмешчаныя 62 выявы, што рэпрэзэнтуюць сем рэгіёнаў Беларусі: касьцюм кожнага зь іх меў адметнасьці ў пашыве ды аздабленьні. 500 асобнікаў выданьня маюць палепшаную якасьць і прадаюцца ў падарункавым футарале. Цана ў «Акадэмкнізе» каля 30 тыс. руб.

**Сыракомля У. Дамок арганіста:** Вершы. Гутаркі. Эсэ. — Менск: Беларускі кнігазбор, 2003. — 96 с.: іл. 1500 ас.

**Сядзібы Беларусі**. — Менск: Рыфтур, 2003. — 76 с.: іл. 1000 ас.

Кніга распавядае пра забудову й уладкаваньне сядзібаў беларускай шляхты.

**Крук Я., Котович О. Колесо времени: Традиции и современность**. — Минск: Беларусь, 2003. — 350 с. 2000 ас.

Аўтары імкнуцца прасачыць, як нашыя продкі асэнсоўвалі час ды ў якіх звычаях і абрадах знайшлі сваё адлюстраваньне іх часавыя ўяўленьні.

**Мароз У. Беларускі храм:** Эсэ. — Менск: Міжнар. Цэнтар культуры кнігі, 2003. — 112 с. 600 ас.

**Пад небам Беларусі:** Фотаальбом/ Тэкст і фота А.Кляшчука. — Менск: Беларусь, 2003. 3000 ас.

«Каб ведаць Беларусь, трэба па ёй вандраваць...», «Большай асалоды, чым адкрываць для сябе сваю краіну, яшчэ ня ведаю...» — гэткімі перакананьнямі кіраваўся аўтар пры стварэньні альбому. Краявіды Беларусі зімою й вясною, летам ды ўвосень, на сьвітаньні й надвячоркам, у сонечным сьвятле й пад пахмурным небам — кожны здымак нясе нешта новае й увадначас да шчымлівага знаёмае. У «Акадэмкнізе» цана 11660 руб.

**Алексиевич С. У войны — не женское лицо**/ В авт. ред. — Москва: Пальмира, 2004. — 317 с. 8000 ас.

Кніга пра другую сусьветную вайну, перакладзеная на 20 моваў, упершыню выходзіць без купюраў. Дакумэнтальная аповесьць папоўнілася новымі эпізодамі і ўрыўкамі зь дзёньніка, які С.Алексіевіч вяла цягам сямі гадоў працы над кнігаю.

**Тацяна Вабішчэвіч**


АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

# Прэмія журналістцы «Нашай Нівы»

Вераніка Дзядок стала пераможцай конкурсу «Надзея для Ўсходняй Эўропы», зладжанага Эвангельскай царквой Нямеччыны. Першае месца, а разам зь ім і месяц стажаваньня ў газэце «Nordwest Zeitung» журналістцы прынесла публікацыя ў «Moskauer Deutsche Zeitung» «А ў кантрабандыста блакітныя вочы». Цырымонія ганараваньня адбылася 28—29 лютага ў Ольдэнбургу.

Запрашаем у падарожжа **7 сакавіка** (нядзеля) у Астравецкі раён: Смургоні — Жодзішкі — Гервяты — Міхалішкі — Варона — Варняны — Гракенікі — Быстрыцы — Астравец — Крэва.
**14 сакавіка** (нядзеля): Ракаў — Івянец — Дзеравўная — Акінчыцы (музэй Коласа) — Стоўпцы — Новы Сьвержань.
**19—22 сакавіка:** Львоў.
Тэл.: 232-54-58; 622-57-20 (Зьміцер), 264-12-38; 776-24-35 (Павал).

## КОШТЫ

**На платныя прыватныя абвесткі (для прыватных асобаў) на старонку 16 рэклямныя расцэнкі:** да 20 словаў (тэкставы модуль) — 2100 руб., за кожныя наступныя 20 словаў (тэкставы модуль) — 2100 руб. Афармленая абвестка з улікам кошту арыгінал-макету за 1 кв. см. — 360 руб.

# На Маскву

## левым вокам

Цікавы vox populi трапіў мне на вочы на сайце расейскага чырвона-карычневага дацзыбао «Стрынгер»:

«У дзень абаронцаў Айчыны мяне ахопліваюць некаторыя сумневы: ці будуць мае суайчыньнікі абараняць такую Айчыну ў выпадку іншаземнай агрэсіі? Ну, амэрыкосам, кітайцам, мусульманам, хутчэй за ўсё, супраціў яшчэ будзе аказаны... А вось, напрыклад, калі Лукашэнка накіруе на Маскву адну дывізію пад лёзунгам «Вызвалім братоў ад гвалту алігархаў, каўкаскай мафіі, карумпаваных чыноўнікаў»? Ну хто выступіць супраць беларусаў? Акрамя сэк'юрыці алігархаў, пары генэралаў ды групкі баевікоў каўкаскіх АГП? А простыя людзі, нават у пагонах, будуць сустракаць хлебам-сольлю. Дойдуць беларусы да Смаленску, а там пакоцяцца. А ў Лукашэнкі іншага выхаду няма: вясной яго заходнія спэцслужбы здымаць будуць. Якія будуць думкі?»

Ідэя капітуляцыі перад войскам Мальцава аказваецца папулярнаю. І наступны наведнік, Siberian Hort з Краснаярску, рапартуе: «Нягледзячы на тое, што ў Белай Русі самая моцная армія ў Эўропе, некалькі валанцёраў з Краснаярску ім лішнімі ня будуць».

Выходзіць, Беларусь мае ў Краснаярску сваю сетку рэзыдэнтаў, якія чакаюць толькі знаку, каб абматацца шашкамі і ўзарваць сябе разам зь Мілерам…

Такія мэтамарфозы загадкавай расейскай душы прымушаюць перагледзець ідэю «эўрапейскага выбару для Беларусі». Што мы забылі ў тым ЕэСе? Ну, станем краінай сьцярвозных бюргераў. Будзем non-stop змагацца за тое, каб Брусэль падняў нам квоту на зьнішчэньне каларадзкіх жукоў…

Не, нашы дэмакраты павінны падтрымаць ініцыятыву стрынгераў. Калі «беларускае ярмо» расейцам пакоціць, бацьку будуць патрэбныя кадры з радзімы. 10 мільёнаў бульбашоў будуць кантраляваць 150 мільёнаў расейцаў! (З улікам зуаваў з Краснаярску гэта 1,2 на 15.) Сфармуецца, вырваная з капіталістычнай вытворчай схемы, субкультура кшталту піратаў, янычараў або казакаў, «часовая аўтаномная зона», паводле тэрміналёгіі клясыка анталягічнага анархізму Хакім-Бея.

Ніводнага подпісу Статкевічу пад ягоную пэтыцыю аб інкарпарацыі Беларусі ў Эўразьвяз! Галоўнае — узяць Смаленск, а там пакоціцца.

А калі не пакоціць, мы нічога не губляем. Калі пасьля першай сэлектарнай нарады ў Крамлі па пытаньнях прыбіраньня сьнегу на дахах расейцы ачухаюцца ад бацькавага гіпнозу, дык на хвалі антыбеларускага супраціву РБ хуценька адпусьцяць у ЭЗ.

**Лёлік Ушкін, чырвоны інтэрнаўт**

## КРЫЖАВАНКА



**Па гарызанталі: 4**. У музыцы: дадатковы, больш высокі тон, які суправаджае асноўны. **9**. Няпоўны курс сярэдняй школы. **10**. Сястра практыкі. **11**. Вытворца рыбных кансэрваў зь Берасьця. **12**. Не эўрапеец, не афрыканец, не амэрыканец і не аўстраліец. **13**. Ёю слаўны Івянец. **18**. Яго намазваюць на хлеб. **20**. Неапрацаваны — празрысты фіялетавы кварц, апрацаваны — … **21**. Вобраз. **22**. Невялікая пасылка. **23**. Гішпанская правінцыя, радзіма Хімэнэса і знакамітае пароды скакуноў. **25**. Мастак, у якога людзі лётаюць. **27**. Ambitio па-беларуску. **28**. Грашовая адзінка Туркмэніі. **32**. Абы-што, нісянеціца. **33**. Прафэсія Лукаша Скарыны. **34**. Гарадзкая птушка. **36**. 1,06 км. **37**. Мохавае балота. **38**. Правільная назва вершу Арсеньневай «Магутны Божа…».

**Па вэртыкалі: 1**. Контур. **2**. Імі кіраваў Язон. **3**. Самы вялікі крывяносны сасуд. **5**. Калі фатаграфуеш …, казаў бравы ваяка Швэйк, яму ня трэба казаць: «Зрабіце прыемны твар». **6**. Грызун. **7**. Якуб … . **8**. Яго прагнуў баран у Кандрата Крапівы. **14**. Наўмысны зрыў работы. **15**. Яшчэ на герб. **16**. Моцны настой альбо раствор чаго-небудзь, разбаўлены вадой для карыстаньня. **17**. Адлюстраваньне, сьлед. **19**. Тэрыторыя бытаваньня чагосьці. **21**. Рэлігія, якая забараняе выяўляць Бога. **24**. Сукупнасьць мітаў. **26**. Празь яго глядзяць у мікраскоп. **29**. Тэмп выкананьня музычнага твору. Ад італьянскага «весела». **30**. Тоўсты дрот ад аглоблі да пярэдняй восі для выраўноўваньня ходу калёсаў. **31**. Беластоцкая пісьменьніца, аўтарка «Бабскіх гісторыяў». **34**. Падвясная сетка для сну на сьвежым паветры. **35**. Грунвальдзкая...

**Склала Сьвятлана Панкавец**

## Адказы на крыжаванку з №7

**Па гарызанталі:** 4. Парафін; 9. Кворум; 10. Камбуз; 11. Атава; 12. Адвал; 13. дЭман; 18. Гапак; 20. Клінкер; 21. Манія; 22. Лейкацыты; 23. Заканурак; 25. Ласты; 27. Балагол; 28. Анчар; 32. Аркуш; 33. Бабка; 36. Зносак; 37. Аратар; 38. Гармата;

**Па вэртыкалі:** 1. Карма; 2. Мандаліна; 3. Міска; 5. Квадра; 6. Аркан; 7. Імпэт; 8. Сутана; 14. Палетак; 15. Пляткар; 16. Перагон; 17. Кінавар; 19. Краты; 21. Менка; 24. Парадыгма; 26. Тырана; 29. Нэктар; 30. Бутсы; 31. Васал; 34. Склад; 35. Манто.




**21 сакавіка** запрашаем на экскурсію **«Гістарычны Пінск».**

Праграма туру:
**Пінск:** капліца XVII ст.; Варварынская царква; палац Бутрымовіча; касьцёл Карла Барамея; манастыр францішканцаў; касьцёл Ушэсьця XVIII ст.; жылая забудова, касьцёл Божай Маці, манастыр езуітаў; сядзіба, драўляная царква XIX ст.; музэі гораду;
**Косава:** палац; сядзіба Касьцюшкаў;
**Парэчча:** парк Скірмунтаў.
Кошт — 18 000 р. для дзяцей і 21 000 р. для дарослых.
Тэлефануйце: 8-029-755-03-70, 222-88-61, 222-88-76 (ф).



## ПРЫВАТНЫЯ АБВЕСТКІ

### ВІТАНЬНІ

**Віншую** Яніну і Алеся Пушкіных з нараджэньнем сына! Генадзь

**Сапраўдную беларусачку** з гістарычнай мясьціны Залесьсе віншую! Дзюба Дзяніс

**Сп.Куманецкі**, а ці не замовіць Вам у мастака тату Lacerta apythana? Сябры-суайчыньнікі

**Віншую ўсіх Ален** з імянінамі, і няхай анёл заўсёды будзе за сьпінай у цяжкую хвіліну. Алена

**Віншую мамульку** любую і сястрычку мілую са Сьвятам вясны — 8 Сакавіка. Жадаю моцнага здароўя. Ursula

### КАНТАКТЫ

**Яснавяльможны пане!** На Ваш ліст чакае гожая ліцьвінка 26 гадоў. А/с 29, 220088, Менск

**Пазнаёмлюся з удаўцом** 45–55 гадоў, разумным, з умелымі рукамі, распрацаванай душой. 220114, Мінск-114, а/с 448

**Разумная і ладная дзяўчына** 26 гадоў будзе радая знаёмству з самастойным, надзейным маладым чалавекам. 220050, а/с 270, Менск

### КНІГІ

**Беларускія часопісы**, кнігі, а таксама музыка і відэа ў Берасьці. Т.: (0297) 27-44-83

### КОНКУРС

**Інфармацыйна-асьветніцкі часопіс «Шахматы-плюс»** пры інфармацыйнай падтрымцы парталу «Беларускія шахматы» (bychess.narod.ru) абвяшчае конкурс на складаньне двуххадовых задач, прымеркаваны да вызваленьня Менску ад нацыстаў. Судзіць будзе майстар Сычоў. Для пачаткоўцаў — добрая магчымасьць паказаць сябе шахматнымі творцамі. Прадугледжаныя прызы. Апошні тэрмін дасылкі задач (на дыяграмах, з поўным рашэньнем) — 1 чэрвеня 2004 г. Адрасы: Сычову У.П., вул. Пугачоўская, 7—12, 220005, Менск. E-mail: rubinchik@lycos. com. Даведкі праз т.: (017) 255-04-18

### ПРАЦА

**Студэнтка Акадэміі мастацтваў** пазаймаецца з Вашай дзяўчынкай маляваньнем, лепкай, бісэрапляценьнем, флярыстыкай або ў якасьці няні. 233-00-00 аб.900, Алена

**Якасна выканаю** пісьмовыя працы па беларускай гісторыі, літаратуры і мове. Зьвяртацца загадзя. 235-18-72. Юрась (пасьля 17-й)

**Шукаю працы** ў інтэлігентным асяродку. 221-21-81. Слава

**Наша Ніва** КУПОН БЯСПЛАТНАЙ ПРЫВАТНАЙ АБВЕСТКІ

Запоўніце гэты купон, і мы надрукуем Вашу абвестку (ня больш за 15 словаў) бясплатна. А/с 537, 220050, Менск.

Тэкст ____________________

Імя і прозьвішча ____________________

Адрас, тэлефон ____________________

**Наша Ніва**
незалежная газэта
заснаваная ў 1906, адноўленая ў 1991
**галоўныя рэдактары «Нашай Нівы»:**
З.Вольскі (1906), А.Уласаў (1906—1914), Янка Купала (1914—1915), А.Луцкевіч, У.Знамяроўскі (1920), С.Дубавец (1991—2000).

| | |
|---|---|
| сакратарка рэдакцыі | Наста Бакшанская |
| галоўны рэдактар | Андрэй Дынько |
| выпускны рэдактар | Арцём Лява |
| карэктар | Сяргей Петрыкевіч |
| карэктарка | Галіна Рабянкова |
| нам. галоўнага рэдактара | Андрэй Скурко |
| тэхнічны рэдактар | Андрэй Чык |
| выдавец і заснавальнік | Фонд выданьня газэты «Наша Ніва» |

**АДРАС ДЛЯ ДОПІСАЎ:**
**220050, Менск, а/с 537**
**Tel/fax: (017) 284-73-29, 8-029-613-32-32, 8-029-707-73-29.**
**E-mail: nn@promedia.by**
**On-line: www.nn.by**

© **НАША НІВА**. Спасылка на «Нашу Ніву» абавязковая. 8 палос фарматам А2, 4 друк. арк. Друкарня РУП «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». Менск, пр. Скарыны, 79. Рэдакцыя не нясе адказнасьці за зьмест рэклямных абвестак. Кошт свабодны. Пасьведчаньне аб рэгістрацыі пэрыядычнага выданьня № 581 ад 4 ліпеня 2002 г., выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусі. Юрыдычны адрас: г. Менск, вул. Калектарная, 20а, п. 2а. Р/р 3015212000012 у МГД ААТ «Белінвестбанк», Менск, код 764.
Наклад 3629. Газэта выдаецца 48 разоў на год.
Нумар падпісаны ў друк 22.00 3.03.2004.
Замова № 1339.
Рэдакцыйны адрас: Менск, Калектарная, 20а/2а